

ЯК ЗМЕНШЫЦЬ КОЛЬКАСЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ-БАНКРУТАЎ

МС

НОВЫЯ РЭКОРДЫ СЕЛЬГАС-ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

20-23



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЛІСТАПАДА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 222 (29336)

+TV ПРАГРАМА МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КАДЛУБАЙ, намеснік міністра адукацыі**

*«У камунікацыі з моладдзю нельга спыняцца. Дыялог павінен быць сталы, але разам з тым канструктыўны. Усе ахвотныя могуць выказаць сваё бачанне далейшага развіцця краіны. І такія ідэі пастаянна гучаць. Напрыклад, моладзь выказвае ініцыятывы па змяненнях у Канстытуцыю, падтрымцы маладых сем'яў, пытаннях адукацыі і працаўладкавання, прасоўванні здаровага спосабу жыцця і многія іншыя. Акрамя таго, дзейнічаюць розныя анлайн-платформы, дзе кожны можа прадставіць свае прапановы. Немалаважна, што моладзь гатовая не толькі прапаноўваць, але і рэалізоўваць ідэі».*

# Смачная навука



У цэнтры ткацтва вёскі Бабічы Чачэрскага раёна наведвальнікам паказваюць, як працаваць на старажытным ткацкім станку — кроснах, бо гэты населены пункт заўсёды славіўся майстрамі ткацкай справы. Але работніцы цэнтра Людміла Міхалькоўская і Таццяна Баранава, калі да іх прыязджаюць групы школьнікаў, наладжваюць таксама інтэрактыўныя майстар-класы па выпечцы дранікаў, і гэтая частка экскурсіі асабліва падабаецца падлеткам. На гэтым здымку Людміла МІХАЛЬКОЎСКАЯ ў ролі гаспадыні і галоўнага кухара праводзіць самы смачны майстар-клас разам з вучнямі гомельскай школы № 57.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• **Амаль палова стацыянарных устаноў сацабслугоўвання ў Беларусі перайшла на вахтавы метад работы.**

• Універсітэт МНС стаў пераможцам Рэспубліканскай універсіяды — 2019.

• **Авіярэйсы па маршруце Пекін — Мінск — Пекін прыпыненыя да 23 лістапада.**

• Палац Горватаў у Нароўлі прададзены на электронных таргах.

• **Навагоднія дрэвы пачнуць прадаваць на Камароўскім рынку з сярэдзіны снежня.**



Прыкметы часу

## КВАТЭРА БЕЗ РАМОНТУ

### Ці можна назваць такое набыццё эканомным?

**Эксперты жыллёвага рынку кажуць аб зніжэнні цэн. Падае кошт кватэр у новабудоўлях Мінска і абласных цэнтраў, зніжаюцца цэны на другасным рынку. Зрэшты, сумы ўсё роўна застаюцца велізарнымі, і адзін са спосабаў сэканоміць на набыцці ўласных метраў — купіць кватэру ў новабудоўлі без адстройвання або кватэру на другасным рынку без рамонту. Падлічана, што такі варыянт дазваляе сэканоміць да 30 % кошту кватэры, да таго ж дае магчымасць зрабіць рамонт з улікам сваіх густаў і патрэб. Але ці сапраўды купля кватэры «пад рамонт» у выніку абернецца для будучых уладальнікаў эканоміяй?**

СТАР. 4



«Наш рамонт доўжыцца ўжо больш за год, — расказалі навасельцы. — Мы займаемся ім па вечарах пасля работы, у выхадныя, у адпачынку».

Фінансавая палітыка

## СЁЛЕТА ІНФЛЯЦЫЯ — КАЛЯ 6 %

### У наступным годзе яе чакаюць блізкай да 5 %

**Аб гэтым заявіў старшыня праўлення Нацыянальнага банка краіны Павел КАЛАУР на анлайн-брыфінгу па выніках пасяджэння праўлення НБ па крэдытна-грашовай палітыцы.**

Асноўным рашэннем праўлення Нацбанка было захаванне на бягучым узроўні (7,75 %) стаўкі рэфінансавання і ставак па пастаянна даступных інструментах рэгулявання ліквіднасці банкаў. Павел Калаур на брыфінгу расказаў, што рашэнне заснавана на сярэднетэрміновым прагнозе дынамікі спажывецкіх цэн, развіцця эканомікі і грашова-крэдытнай сферы.

### АСЛАБЛЕННЕ БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ Ў ВЫНІКУ ПАВЫШАНАГА ПОПЫТУ НА ЗАМЕЖНУЮ ВАЛЮТУ

Па словах кіраўніка Нацбанка, гадавая інфляцыя ў краіне паскорылася і па выніках кастрычніка склала 6,2 %. «Галоўным чынам на рост цэн паўплывала тое, што адбылося ў жніўні: аслабленне беларускага рубля ў дачыненні да замежных валют. У першую чаргу гэта адбілася на цэнах на імпартуемыя тавары нехарчовай групы.

Аслабленне нашага рубля адбылося ў выніку павышанага попыту на замежную валюту на ўнутраным валютным рынку. Гэтаму спрыялі ўзрослыя негатыўныя чаканні адносна перспектыў далейшага развіцця эканомікі. Адначасова назіраўся адток рублёвых і валютных зберажэнняў з банкаў.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X
20222
9 771990 763008

# Год складаны, але прыбытковы

## Да 15 лістапада ўсе работы па ўборцы ўраджаю неабходна скончыць

**Пра гэта Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка нагадаў на рабочай сустрэчы з міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання Іванам Крупко і віцэ-прэм'ерам Аляксандрам Субоціным.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што аграрыі вельмі нядрэнна адпрацавалі гэты год. Засталося толькі пераараць убраныя палі, па максімуме падняць зябліва, каб не было праблемы з ім увесну. Яшчэ адна задача з перспектывай — стварыць запасы паліва на вясну, скарыстаўшыся тым, што цэны на нафтапрадукты ўпалі.

Прэзідэнт пацікавіўся ў міністра эфектыўнасцю работы сельскай гаспадаркі і фінансавай сітуацыяй на прадпрыемствах АПК. «Я разумею, што вёсцы вельмі няпроста. Ёй заўсёды было няпроста. За мяжой аказваецца сур'ёзная падтрымка сельскім прадпрыемствам, фермерам. Мы таксама падтрымліваем сельскую гаспадарку, наколькі можам», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ адна тэма, якая, па думку Прэзідэнта, датычыцца ў асноўным віцэ-прэм'ера, — захаванне ўраджаю і яго пастаўка ў магазіны. Ён звярнуў увагу, што на гэтым тыдні, размаўляючы з кіраўніком прафсаюзаў Міхаілам Ордам, папрасіў узяць на кантроль цэнаўтварэнне па асноўных пазіцыях тавараў. «Сярод асноўных у нас да 60 пазіцый, па якіх кантралюем цэны, — гэта прадукты харчавання, то-бок вашы пытанні. Таму мы дамаўляемся, што поўнасцю краіна нарыхтуе стабілізацыйныя фонды, да мая-ліпеня запасаў прадуктаў харчавання каб хапіла краіне. Асабліва агародніну, бульбу і зерне для хлебапячэння трэба поўнасцю нарыхтаваць», — даручыў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама даў заданне ўзяць пад кантроль работу мясцовай вертыкалі ўлады па забеспячэнні харчаваннем насельніцтва ў зімовы і веснавы перыяды, каб не было хістання цэн у бок павелічэння вясной.

Прэзідэнт папрасіў міністра і намесніка кіраўніка ўрада па выніках года далажыць, як спрацавала Віцебшчына ў эксперыменце з сямю інтэграванымі структурамі ў АПК, адзначыўшы, што «ні ў якім разе нельга прапусціць гэта пытанне». «Кожны год трэба кантраляваць, якую аддачу дае гэта сістэма работы. А потым (мне здаецца з вопыту, гэта нядрэнная сістэма работы) яе прыйдзецца перакладваць на іншыя вобласці. Магчыма не ў цэлым, але на асобныя раёны, рэгіёны абласцей», — адзначыў Прэзідэнт.

Галоўнае ж стратэгічнае пытанне да кіраўнікоў аграрнага сектара — праграма для сельскай гаспадаркі на пяцігодку, якую неабходна прадставіць на будучым Усебеларускім сходзе.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### У тэму

**Аляксандр СУБОЦІН, намеснік прэм'ер-міністра,** растлумачыў, чаму цэны на агародніну часам адрозніваюцца ў залежнасці ад пары года.

«Даручэнне атрымалі, таму ў гэты раз усё будзе добра і ўсёй лінейкай прадуктаў па адэкватных цэнах мы будзем забяспечаны, — падкрэсліў Аляксандр Субоцін. — Часам «гуляюцца» і сеткі, калісьці лагістыка дае збой, калісьці свядома хтосьці раздувае праблему ў сродках масавай інфармацыі і гэта правакуе скачкі цэн. Усюды свая прычына, але ўсё вяртаецца ў нармальную каляіну».

Па словах віцэ-прэм'ера, за дзевяць месяцаў года экспартам сельская гаспадарка, нягледзячы на пандэмію, прырасла на 233 мільёны долараў у параўнанні з мінулым годам. «У нас, як правіла, рэдка заканчваецца нешта з прадуктаў, бо мы самі сябе забяспечваем у поўным аб'ёме, ды і яшчэ гандлюем на мільярды долараў. У гэтым годзе ўжо больш за 100 краін, з якімі мы маем гандлёвыя адносіны ў сферы прадуктаў харчавання», — сказаў ён.

**Іван КРУПКО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання,** падзяліўся лічбамі: «Па выніках дзесяці месяцаў 2020 года аб'ём вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ва ўсіх катэгорыях гаспадарак вырас на 104,6 %».

Па словах Івана Крупко, аб'ём росту на сельскагаспадарчых прадпрыемствах — 106,7 %. Пры гэтым прыватныя падсобныя гаспадаркі спрацавалі на 96 % да ўзроўню мінулага года.

Іван Крупко паведаміў пра асноўныя складнікі праграмы развіцця АПК на будучую пяцігодку — нарасціць аб'ёмы прадукцыі на 114 %, атрымаць у свірнавай вазе 10 мільёнаў тон зерня, вырасці ў аб'ёмах вытворчасці малака да 9,2 мільёна тон, забяспечыць устойлівы фінансавы рост АПК краіны ў цэлым.

Ініцыятыва

# ГАЛАСЫ З МЕСЦАЎ

**Па ўсёй краіне пачалі дзейнічаць грамадскія прыёмныя. Сюды прыходзяць з рознымі прапановамі па пытаннях канстытуцыйнай рэформы і іншых актуальных праблем краіны і рэгіёнаў. Агучваюць праблемы, якія ўзнікаюць у сацыякультурнай сферы, эканамічнай галіне, маладзёжнай палітыцы і іншых кірунках.**

— Падчас правядзення ў вобласці дыялогавых пляцовак неаднаразова гучалі ініцыятывы больш задзейнічаць рэгіянальную заканадаўчую і выканаўчую ўладу, больш актыўна прыцягваць мясцовыя органы ўлады да вырашэння пытанняў сацыяльнай сферы, эканамічнай і маладзёжнай палітыкі. Таму такая форма, як грамадскія прыёмныя, безумоўна, павысіць узровень палітычнай культуры грамадства, — перакананы **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Генадзь ЯГОРАЎ,** які разам з іншымі спецыялістамі ведамства правёў першы прыём грамадзян у абласной грамадскай прыёмнай.

Кіраўнік упраўлення перакананы, што такая форма дыялогу з насельніцтвам будзе запатрабаванай. Напрыклад, настаўніца адной са школ горада, якая прыйшла ў грамадскую прыёмную, бачыць магчымасць павышэння якасці адукацыі шляхам змяншэння колькасці вучняў у класе. Яшчэ адзін дасведчаны педагог, прадстаўніца Беларускага саюза жанчын закранула тэму ўмацавання інстытута сям'і ў выхаванні дзяцей, павышэння ролі бацькі. З прапановамі распрацаваць дзяржаўную праграму патрыятычнага выхавання моладзі і змяніць сістэму выбараў у парламент звярнуўся член абласнога Саюза афіцэраў.

— Усе пазначаныя ініцыятывы будуць падагульнены, сістэматызаваны, а затым накіраваны ў адпаведныя камітэт шостага Усебеларускага народнага сходу, — дадаў Генадзь Ягораў.

У Віцебску абласная грамадская прыёмная размешчана ў Доме прэсы (вул. Гогаля, д. 17, першы паверх, актавая зала). На гэтай жа пляцоўцы адкрыта гарадская грамадская прыёмная. Яны будуць весці прыём двойчы на тыдзень — у сераду і пятніцу. Што датычыцца ўсёй вобласці, то з 11 лістапада грамадскія прыёмныя арганізаваны ў кожным раёне.

У Магілёўскім аблвыканкаме грамадская прыёмная будзе працаваць да канца месяца. Нагадаем, сваю дзейнасць яна распачала яшчэ 9 лістапада.

— Як паказаў вопыт правядзення дыскусійных пляцовак у кастрычніку, гэта вельмі дзейсны інструмент у вырашэнні набалелых пытанняў, — падкрэсліў **першы сакратар Магілёўскага абласнога камітэта «БРСМ» Уладзімір ПАЎЛОЎСКІ.** — Тыя людзі, якія не трапілі на дыскусійныя пляцоўкі, зараз могуць скарыстацца дадатковай магчымасцю — прыйсці ў грамадскую прыёмную або патэлефанаваць. Вітаюцца канструктыўныя прапановы, у прыватнасці, што да мяне, па маладзёжнай палітыцы. Іншыя пытанні — эканомікі, сацыяльнай палітыкі і гэтак далей — займаюцца іншыя эксперты. Падчас майго дзяжурства паступіла прапанова наконт наладжвання для абітурыентаў і студэнтаў прамысловага турызму на прадпрыемствы і ў арганізацыі. Маўляў, вельмі часта моладзь не мае ўяўлення пра тое, што яе чакае ў абранай прафесіі. Маладыя людзі таксама выказваліся наконт прэферэнцый і льгот для студэнтаў-прадпрымальнікаў і неабходнасці больш дасканала праводзіць аналіз рынку працы для студэнтаў, каб не перанасычаць яго непатрэбнымі кадрамі. Самае карыснае ў такіх выпадках тое, што аўтар ідэі не толькі агучвае яе, але яшчэ і прапаноўвае шляхі вырашэння.

Грамадская прыёмная Магілёўскага аблвыканкама працуе з 17.00 да 19.00 да канца лістапада. Падрабязны графік дзяжурстваў са спісам экспертаў ёсць на сайце аблвыканкама.

Жыхары Гомельскага рэгіёна свае прапановы па ўдасканаленні нацыянальнага заканадаўства могуць агучыць у грамадскай прыёмнай, якая распачала сваю дзейнасць пры Гомельскім абласным выканаўчым камітэце.

Прапановы можна пакінуць у грамадскай прыёмнай у аўторак і чацвер з 16.00 да 18.00 па адрасе: Гомель, пр. Леніна, 2, каб. 106. Меркаванні, ініцыятывы ў вызначаны час прымаюцца як асабіста, так і па тэлефоне 8 (0232) 33-12-37.

У Брэсцкай вобласці адна з першых грамадскіх прыёмных пачала дзейнічаць у Пружанскім раёне — 11 лістапада. Сустрэчы прайшлі ў гарадскіх пасёлках Ружаны і Шарашэва. Яны будуць арганізаваны штотыднёва па серадах. У Пружанскім райвыканкаме прапановы грамадзян будуць прымаць па аўторках і чацвяргах. У гэтыя ж дні грамадскія прыёмныя будуць адкрыты ў адміністрацыях Маскоўскага і Ленінскага раёнаў Брэста, Пінскім райвыканкаме, Кобрынскім і Камянецкім райвыканкамах, Маларыцкім Доме культуры, будынку Лунінецкага філіяла агенцтва па дзяржрэгістрацыі і зямельным кадастры.

Ужо не першы год грамадскія прыёмныя выступаюць своеасаблівай пераграворнай пляцоўкай на Гродзеншчыне. Жыхары рэгіёна наўпрост звяртаюцца да прадстаўнікоў мясцовай улады з любымі пытаннямі, праблемамі і прапановамі, якія іх цікавяць. Як паказвае практыка, тэмы, што выклікаюць занепакоенасць у грамадзян, надзённыя па характары. Разам з тым сярод іх гучыць і нямала канструктыўных прапаноў і слушных ініцыятыў. Толькі за дзесяць месяцаў бягучага года ў грамадскую прыёмную абласной арганізацыі РГА «Белая Русь» звярнуліся сотні чалавек. Варта заўважыць, што наладжаная ў рэгіёне форма працы з грамадзянамі, безумоўна, прыносіць свой плён. Бо многія глабальныя пытанні вырашаюцца менавіта тут.

Таму лагічна, што грамадскія прыёмныя зноў актывізавалі сваю дзейнасць. У офісе абласной арганізацыі РГА «Белая Русь» прамую тэлефонную лінію правёў **член Прэзідыума Гродзенскага абласнога Савета РГА «Белая Русь» Святаслаў ЛІС.**

— Людзям важна быць пачутымі. Таму любы, хто пажадае, можа патэлефанаваць і агучыць пытанні, якія яго хвалююць, — адзначыў суразмоўнік. — Апошнім часам усё больш грамадзян звяртаюцца за канкрэтнымі тлумачэннямі, напрыклад, заканадаўчых аспектаў, таксама ўносяць свае прапановы па ўдасканаленні заканадаўства краіны, дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, будаўніцтва.

Грамадскія прыёмныя працягнуць работу ў лістападзе і снежні не толькі ў Гродне, але і ў раённых цэнтрах.

**Вольга АНУФРЫЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Блізкая ўлада

# ПЫТАННІ ВЫРАШАЙЦЕ ДЫСТАНЦЫЙНА

**Традыцыйна, па суботах, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 14 лістапада, з 9.00 да 12.00 праводзяць:

* першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валерый Васілевіч РЭБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

* намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

* старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Міхайлавіч САЛАВЕЙ. Тэл. 8 023 233 12 37;

* старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

* намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

* намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

* намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Вікенцевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

**Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» сообщает о внесении следующих изменений в извещение о проведении 17 ноября 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ» *(опубликовано в газете «Звязда» 31.10.2020»):***

- предметы торгов № 7, 8, 10, 12, 16, 24, 25, 34, 36 исключаются из текста публикации в связи с отказом продавца от проведения аукциона.

**Телефон для справок +375 (17) 360 42 22.**
**Адрес в сети интернет: www.mgcn.by.**

УНП 190398583

**Изменение в проектную декларацию по объекту «Жилая усадебная застройка для многодетных семей в микрорайоне Сокол в г. Минске» 3-я очередь строительства,** опубликованную в № 221 (29335) от 12.11.2020

- в жилом доме № 69 – для нормативной площади – 2 151,78 белорусских рублей, для площади, превышающей нормативную – 2 223,79 белорусских рублей;

- в жилом доме № 70 – для нормативной площади – 2 249,67 белорусских рублей, для площади, превышающей нормативную – 2 291,56 белорусских рублей.

УНП 192400611

Свидетельство о государственной регистрации ООО «АКВАГЕОПЛАСТ» (УНП 190612375) **считать недействительным в связи с утерей.**

Свидетельство о государственной регистрации ООО «Телескоп» (УНП 190749674) **считать недействительным в связи с утерей.**

# СЁЛЕТА ІНФЛЯЦЫЯ — КАЛЯ 6 %

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Павел Калаур лічыць, што цяпер сітуацыя на фінансавым рынку стабілізуецца. У верасні і кастрычніку запаволіўся адток сродкаў з банкаўскай сістэмы. Сфарміравалася чыстая прапанова замежнай валюты. Гэта спрыяла адноснаўстойлівай дынаміцы абменнага курсу. Аналіз бягучай сітуацыі сведчыць аб тым, што фактары, якія ляжаць у аснове паскарэння інфляцыі, носяць часовы характар. Іх уплыў будзе слабець.

## ПАД УЗДЗЕЯННЕМ ЗНЕШНІХ ФАКТАРАЎ

Па выніках бягучага года прырост спажывецкіх цэн чакаецца каля 6 %. У далейшым прагназуецца паступовае запаволенне інфляцыйных працэсаў. Да канца 2021 года інфляцыя наблізіцца да мэтавага ўзроўню 5 %.

Кіраўнік Нацбанка заўважыў: ёсць верагоднасць, што аднаўленне сусветнага эканамічнага росту будзе працягласе. Далейшае пагаршэнне эпідэміялагічнай абстаноўкі ў свеце замарудзіць працэс аднаўлення.

Слабы попыт абмяжуе інфляцыю ў замежных краінах. У гэтых умовах мяркуецца правядзенне мяккай грашова-крэдытнай палітыкі Еўрапейскім цэнтральным банкам, Федэральнай рэзервовай сістэмай ЗША і Банкам Расіі. Пры гэтым чакаецца, што інфляцыя за мяжой застанецца ніжэйшай за мэтавыя параметры да канца 2021 года.

«Усе гэтыя знешнія фактары ў сукупнасці акажуць стрымальны ўплыў на інфляцыю ў Беларусі праз цэны імпартуемых тавараў, а таксама на эканамічную актыўнасць краіны ў цэлым», — мяркуе старшыня праўлення Нацбанка.



Таксама трэба мець на ўвазе рызыкі, што могуць прывесці да адхілення інфляцыі ад прагнозу.

«На фоне пандэміі захоўваецца нявызначанасць адносна будучай траекторыі аднаўлення дзелавой актыўнасці ў свеце, у дзяржавах — гандлёвых партнёрах Беларусі, а таксама яе ўплыву на нашу краіну. Унутраныя рызыкі звязаныя з чаканнямі эканамічных агентаў, нармалізацыя якіх можа адбывацца павольней, чым меркавалася», — прызнаў Павел Калаур.

## БАНКАЎСКІ СЕКТАР ПРАЦУЕ ЎСТОЙЛІВА

**Намеснік старшыні праўлення Нацбанка Сяргей КАЛЕЧЫЦ** зазначыў, што на бягучы момант забяспечваецца цалкам устойлівая работа банкаўскага сектара. «Банкамі выконваюцца ўсе асноўныя нарматывы бяспечнага функцыянавання. Узровень дастатковасці нарматыўнага капіталу па стане на 1 кастрычніка складае 16,4 %, пры тым што для кожнага асобнага банка мінімальны ўзровень з улікам кансервацыйнага буфера — 12 %. Таму запас дастатковасці па сістэме ў цэлым вельмі добры. І казаць у гэтай сувязі аб неабходнасці масавай дакапіталізацыі няма ніякіх падстаў», — адзначыў Сяргей Калечыц.

Разам з тым асобныя банкі праводзяць дакапіталізацыю ў рамках сваіх планаў развіцця ва ўзаемадзеянні з уласнікамі, у тым ліку з дзяржавай.

## ПАЛІТЫКА ПЛАВАЮЧАГА КУРСУ

Пацікавіліся ў Сяргея Калечыца, які бачыцца курс беларускага рубля налета. Прадстаўнік Нацбанка адзначыў, што праект рэспубліканскага бюджэту на наступны год зараз распрацоўваецца.

Так, у аснову разліку рэгулятар заклаў здагадку аб 1,5 % зніжэння рэальнага эфектыўнага курсу беларускага рубля ў наступным годзе.

«У бюджэт закладваюцца пэўныя прагнозы нашага абменнага курсу — гэта неабходна для планавання валютных даходаў і выдаткаў. У рамках адпаведных сцэнарыяў развіцця эканомікі, якія прапрацоўваюцца, мы ўстрымліваемся ад любых ацэнак з пункту гледжання абменнага курсу, бо праводзім палітыку плаваючага курсу. Любая наша здагадка або ацэнка ўспрымаецца эканомікай як нейкае абавязацельства з боку цэнтральнага банка. Магу толькі сказаць, што ў аснову разліку мы закладвалі здагадку аб 1,5 % зніжэння рэальнага эфектыўнага курсу беларускага рубля ў наступным годзе», — растлумачыў намеснік старшыні праўлення Нацбанка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# ВОСЬ І ПЕРШЫ МОКРЫ СНЕГ

## А ў аўторак падмарозіць нават удзень

**У першай дэкадзе лістапада было анамальна цёпла, калі сярэднясутачная тэмпература на 3—5 градусаў перавышала кліматычную норму. Такі тэмпературны рэжым адпавядаў сярэдзіне кастрычніка. На гэтым тыдні на надвор'е пачаў уплываць халодны антыцыклон, пасля чаго тэмпература паветра паступова наблізілася да звыклых паказчыкаў лістапада, а ападкаў практычна не было. У выхадныя чакаецца дажджы з мокрым снегам, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



У суботу надвор'е будзе вызначаць атмасферны фронт, які ссоўваецца з боку Заходняй Еўропы. Будзе воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У асобных раёнах магчымы слабы туман, уначы і раніцай слабы галалёд. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла, у паўднёва-заходніх раёнах — 4–5 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе ад нуля да плюс 6 градусаў, па паўднёвым захадзе — 7–9 цяпла.

Падобнае надвор'е захаваецца і ў нядзелю. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі Беларусі надвор'е будзе абумоўлена вобласцю павышанага атмасфернага ціску. Уначы месцамі, удзень толькі па паўднёвым усходзе чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, а ўначы — дождж з мокрым снегам. У асобных раёнах магчымы слабы туман, уначы і раніцай месцамі слабы галалёд. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 градуса да 5 цяпла, па ўсходзе — да 3 марозу. Удзень будзе ад нуля да плюс 6 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах — 7—10 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня актыўныя франтальныя раздзелы будуць далёка ад нашай тэрыторыі, а надвор'е ў краіне будзе фарміраваць заходняя вільготная перыферыя халоднага антыцыклону, які раскінуўся над Усходне-Еўрапейскай раўнінай. У панядзелак у асобных раёнах краіны магчымы невялікія ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Уначы і раніцай чакаюцца слабыя туман і галалёд. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла. Удзень будзе ад нуля да 7 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 9 цяпла.

Аўторак стане першым днём гэтай восенню, калі месцамі будзе падмарожваць і ўдзень. Чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Вецер прагназуецца паўднёвы, паўднёва-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла, па ўсходзе пры праясненнях — да 4 марозу. Удзень будзе ад мінус 1 градуса да 6 з плюсам.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Аты-баты

# У армію – праз каранцін



**У гэтыя дні ў Беларусі пачалася адпраўка ў войска хлопцаў, прызваных на тэрміновую ваенную службу і службу ў рэзерве. Усяго будзе прызвана каля 10 тысяч чалавек. Дзвесце юнакоў пройдуць службу ў рэзерве. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве абароны.**

Як і ўвесну, свае асаблівасці ў прызыўную кампанію ўнёс каранавірус. Праз эпідэмічную сітуацыю ў Мінскім гарадскім і ўсіх абласных і зборных пунктах праводзяцца дадатковыя прафілактычныя мерапрыемствы. А ўсе навабранцы абавязкова правядуць два тыдні на каранціне, перш чым пачнуць асвойваць курс маладога байца.

У першы дзень у войска было накіравана каля тысячы прызыўнікоў. Яны адправяцца ў 72-гі аб'яднаны навучальны цэнтр, сілы спецыяльных аперацый, Мінскую ваенную камендатуру і роту інфармацыйных тэхналогій.

Ваенную прысягу салдаты прымуць 12 снежня.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Інфармбяспека

# НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ І СУЧАСНЫЯ ВЫКЛІКІ

**Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы і міжнароднае інфармацыйнае агенцтва «Расія сёння» 17—18 лістапада праводзяць экспертна-медыйны форум «Інфармацыйная бяспека Саюзнай дзяржавы: сучасныя выклікі і новыя тэхналогіі». Абмеркаванне актуальных праблем будзе праходзіць на аўтарытэтнай пляцоўцы міжнароднага мультымедыйнага прэс-цэнтра МІА «Расія сёння».**

Удзел у дыскусіях прымуць і дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота, і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Уладзімір Сямашка, і старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Генадзь Давыдзька, кіраўнікі беларускіх і расійскіх мас-медыя, эксперты, палітолагі, палітычныя публіцысты. Сваімі развагамі абяцаюць падзяліцца пісьменнік, аўтар кніг «Я маніпулюю табой», «Анатомія былтаніны» Мікіта Няпрахін, старшыня Саюза журналістаў Расіі Уладзімір Салаўёў, старшыня савета дырэктараў газеты «Камсамольская праўда», генеральны дырэктар радыёстанцыі «Гаворыць Масква» Уладзімір Мамантаў, скульптар, аўтар Ржэўскага мемарыяла савецкаму салдату Андрэй Карабцоў.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кароль Бахрэйна прызначыў наследнага прынца новым прэм'ерам



Наследны прынц Бахрэйна Сальман бен Хамад бен Іса Аль Халіфа прызначаны новым кіраўніком урада. Як паведаміў тэлеканал Sky News Arabia, адпаведны ўказ выдаў кароль Бахрэйна шэйх Хамад бен Іса Аль Халіфа. Папярэдні кіраўнік Савета міністраў каралеўства Халіфа бен Сальман Аль Халіфа памёр у амерыканскай клініцы, дзе праходзіў лячэнне, не дажыўшы два тыдні да 85-годдзя. Экс-прэм'ер быў прызначаны на сваю пасаду 15 жніўня 1971 года, на наступны дзень пасля абвяшчэння незалежнасці Бахрэйна, і ўзначальваў урад да самай смерці. Ён стаў даўгавечнікам на гэтай пасадзе, займаў яе амаль пяць дзесяцігоддзяў і па праве лічыцца сусветным рэкардсменам па часе знаходжання ў крэсле прэм'ер-міністра. У адпаведнасці з канстытуцыяй 2002 года, частка яго паўнамоцтваў перайшла каралю, які атрымаў права прызначаць і звальняць міністраў. Прынц Халіфа бен Сальман Аль Халіфа лічыўся найбагацейшым членам правячай сям'і і адным з найбуйнейшых бізнесменаў у каралеўстве.

## Rolls Royce мяркуе пабудаваць у Вялікабрытаніі 16 міні-АЭС

Кансорцыум кампаній пад кіраўніцтвам Rolls Royce (больш вядомай сваімі лімузінамі прадстаўніцкага класа і авіяцыйнымі рухавікамі) абвясціў аб планах пабудаваць у найбліжэйшыя пяць гадоў у Англіі 16 міні-АЭС з модульнымі рэактарамі, перадала «Бі-бі-сі». Чакаецца, што гэта створыць каля шасці тысяч новых рабочых месцаў і ўрад укладзе ў праект, прынамсі, 200 мільёнаў фунтаў у рамках даўно аднкладзенага плана па ажыўленні эканомікі. Кіраўніцтва кансорцыума запэўнівае, што акрамя вытворчасці электрычнасці з нізкімі выдаткамі і выкідамі $CO_2$ гэта створыць новы артыкул экспарту. Урад, у сваю чаргу, сцвярджае, што атамная энергетыка неабходная краіне, калі тая хоча дамагчыся нулявога вугляроднага балансу (калі выкід вуглякіслага газу ў атмасферу і яго паглынанне ўраўнаважаны) да 2050 года. Праблема ў тым, што шэсць з сямі дзеючых у краіне рэактараў адпрацуюць свой рэсурс да 2030 года, а апошні будзе выведзены з эксплуатацыі ў 2035-м. Зараз на іх долю прыпадае каля 20 працэнтаў усёй энергіі, якая выпрацоўваецца ў краіне.



## У Коста-Рыцы ўвялі надзвычайнае становішча з-за наступстваў урагану «Эта»

Адпаведны ўказ падпісаў прэзідэнт краіны Карлас Альварада, паведаміла выданне The Tico Times. На думку ўлад, дзякуючы ўвядзенню рэжыму надзвычайнага становішча, удасца паскорыць работы па ліквідацыі наступстваў стыхіі, аднаўленні інфраструктуры і аказанні дапамогі пацярпелым. Паводле ацэнак Нацыянальнай камісіі па надзвычайных сітуацыях, з-за праліўных дажджоў, выкліканых ураганам «Эта», пацярпела каля 325 тысяч чалавек, з небяспечных раёнаў эвакуявана больш за дзве тысячы чалавек. Пашкоджаны дарогі, разбураны масты, у выніку чаго перапынена злучэнне з больш чым 20 населенымі пунктамі.

# КВАТЭРА БЕЗ РАМОНТУ

## ЧАРНАВЫ ВАРЫЯНТ

Новабудоўля без адстройвання — самы бюджэтны спосаб атрымаць уласныя метры ў новым доме. Але гэта менавіта метры — проста бетонная «скрынка», дзе з выгод цывілізацыі — падвядзеня камунікацыі (электрычнасць праведзена да лічыльніка, вада — да вывадаў у кватэру), самыя танныя ўваходныя дзверы і шклопакеты. Могуць адсутнічаць міжпакаёвыя перагародкі: гэта называецца «свабодная планіроўка».

Часцей навасельцы схіляюцца да так званага чарнавога адстройвання. Гэта тая ж бетонная «скрынка», дзе зроблена заліванне сцяжкі падлогі, ёсць радыятары ў пакоях і лоджыя зашклёная. Часам у такое адстройванне можа ўваходзіць разводка электрыкі па пакоях і гідраізаляцыя ў ваннай.

**ПЛЮСЫ ТУТ ВІДАВОЧНЫЯ.**

✓ Перш за ўсё гэта магчымасць на наяўную суму стаць уладальнікам кватэры з лепшым размяшчэннем і большай плошчай.

✓ Магчымасць рэалізаваць свае праекты — вы атрымліваеце «чыстае палатно» і самі вырашаеце, якое будзе ваша жыллё.

✓ Ключы ўладальнікам кватэр без адстройвання або з чарнавым адстройваннем забудоўшчыкі перадаюць хутчэй, чым здаюць у эксплуатацыю кватэры «пад ключ».

✓ Усе недахопы і недапрацоўкі будаўнікоў — як на далоні. Яны не схаваныя пад тынкоўкай і шпалерамі.

**АЛЕ І МІНУСАЎ ДАСТАТКОВА.**

• Калі вы не гатовыя жыць у кватэры, што рамантуецца, то ўехаць у новае жыллё вам давядзецца ў лепшым выпадку праз паўгода пасля здачы дома.

• Такое жыллё патрабуе досыць доўгага «бруднага рамонту» — прыйдзецца раўняць сцены, рабіць сцяжку падлогі, пракладваць камунікацыі.

• Немагчыма адразу палічыць выдаткі на рамонт: цэны на работы і матэрыялы могуць значна вырасці.

• Суседзі ў такіх дамах таксама будуць рабіць рамонт, а значыць, першыя некалькі гадоў будзе шумна.

Дадайце да гэтага стомленасць, бо мінімум паўгода (а звычайна даўжэй) у вас, па сутнасці, не будзе вольнага часу: яго «з'есць» рамонт. Нават калі вы ноймеце прафесіяналаў, вам прыйдзецца выбіраць матэрыялы, магчыма, узгадняць перапланіроўку, кантраляваць рабочых. Вы плануеце рабіць рамонт сваімі сіламі? Ён непазбежна зацягнецца. Асабліва калі вопыту падобных работ у вас няма. Да таго ж новы дом звычайна дае ўсадку, і гэта можа сапсаваць ваш новенькі рамонт.

## БАБУЛІНА «ХРУШЧОЎКА»

Яшчэ адзін эканомны варыянт набыцца жылля — кватэра без рамонту на другасным рынку. Вы атрымліваеце метры з дызайнам 1970-х, дзе гадоў 30—40 ніхто нават не спрабаваў зрабіць касметычны рамонт. І цалкам перарабляеце іх пад сябе.

**ПЛЮСЫ ТАКОГА ВЫБАРУ:**

✓ Магчымасць стаць уладальнікам жылля большай плошчы і з лепшай лакацыяй: замест двухпакаёўкі з рамонтам можна купіць трохпакаёўку без рамонту бліжэй да метро або да цэнтра горада.

✓ Дом пабудаваны даўно і не дасць усадкі — адстройванне кватэры будзе ў бяспецы.

✓ Кватэры савецкага ўзору — напрыклад, тыя ж «хрушчоўкі», якія ніхто не любіць — даюць магчымасць для перапланіроўкі. У іх адсутнічаюць апорныя сцены ўнутры кватэры. У сучасных панэльных дамах рабіць перапланіроўку больш складана.

✓ Жыць у цагляным доме на 40—60 кватэр утульней, чым у сучаснай шматпавярхоўцы з сотнямі суседзяў. А ўтульнасць старых гарадскіх дворыкаў не параўнаць з «голымі» дварамі новабудоўляў.

**НУ, А МІНУСЫ ТУТ** — практычна тыя ж, з якімі сутыкаюцца ўладальнікі новабудоўлі без адстройвання. Вам прыйдзецца пачынаць з «бруднага рамонту»: мяняць камунікацыі, раўняць сцены і г. д. Дадайце да гэтага неабходнасць вывозіць старую мэблю і іншы хлам, які ранейшы ўладальнік, хутчэй за ўсё, пакіне вам. Ну і дамаўляцца з пажылымі суседзямі, якія могуць быць незадаволеныя шумам ад вашага рамонту.

## АСАБІСТЫ ДОСВЕД

Ірына і Чэслаў — маладая пара з Мінска — купілі зусім «забітую» трохпакаёвую кватэру на другасным рынку больш за год таму. Рамонт у іх жыцці здарыўся ўпершыню. Маладая сям'я заехала ў кватэру і вырашыла рамантаваць жыллё сваімі рукамі, з мінімальным прыцягненнем спецыялістаў.

— Усё ўпіралася ў грошы. Мы спадзяваліся, што так нам удасца сэканоміць, — расказвае Ірына. — Па факце эканоміі не атрымалася. І на гэтым шляху нас чакала мноства адкрыццяў. Напрыклад, аказалася, што каб разламаць тое, што тут нарабілі за многія дзесяцігоддзі, патрэбны надзвычайныя намаганні і нямала грошай. Нам прыйшлося разбіраць усё цалкам — да перакрыццяў, да голых сцен. Гэта заняло амаль тры месяцы і запатрабавала велізарных затрат працы.

У Ірыны да гэтага рамонту вопыту будаўнічых работ не было. Чэслаў падчас вучобы ва ўніверсітэце працаваў на будоўлі, і, як кажа Ірына, гэта дапамагло пазбегнуць многіх памылак — без будаўнічага вопыту рамонт абышоўся б яшчэ даражэй.

— Мы не зрабілі б самі сцяжку і не змаглі б выраўнаваць сцены пад афарбоўку. Без навыку гэта зрабіць вельмі цяжка, — кажа Ірына. — Я вучылася на тых месцах, дзе не вельмі прыкметна. У цэлым, вучыцца давялося вельмі шмат чаму. Мы чыталі, глядзелі відэа, раіліся з бацькамі. З майстроў мы звярнуліся толькі да электрыкаў, таксама прафесіяналы рабілі разводку труб і ўкладвалі плітку на сцены ў ваннай — плітка ў нас вялікага памеру, і нам складана было якасна пакласці яе самім.



Высветлілася, што падчас рамонту кватэры б/у могуць чакаць сюрпрызы, якія немагчыма прадбачыць.

— Мы планавалі проста пакласці ламінат, але калі знялі стары лінолеум, аказалася, што пад ім усё прагніло. Нам давялося заліваць сцяжку, перасцілаць падлогу, і гэта моцна падоўжыла тэрмін работ. Так што калі пры куплі другаснага жылля вы плануеце толькі чыставы рамонт, ёсць рызыка «ўляцець» на «брудныя» работы. Старыя дамы — гэта старыя камунікацыі, трубы, электраправодка, а ў некаторых дамах — яшчэ і прагнілыя перакрыцці. Наймаючы спецыялістаў, будзьце гатовыя, што такія работы каштуюць дорага, а пры самастойным выкананні гэта велізарны расход сіл і часу, — расказваюць навасельцы. — Затое мы адшукалі мноства «рарытэтаў» — пачак цыгарэт 1978 года, замураваны ў сцяну, газеты савецкіх часоў пад шпалерамі, брашуру «Памятка маладому хрысціяніну» 1992 года пад падлогай.

Першапачатковая сума, узятая ў крэдыт на рамонт, складала ў эквіваленце $ 10 000. Па падліках, яе павінна было хапіць на матэрыялы, і нават мэблю. Аказалася, што для трохпакаёвай кватэры гэтая сума — прыкладна палова неабходнай. Яе хапіла на «брудныя» работы і мінімальны чыставы рамонт, расказалі сужэнцы.

— Мы не куплялі дарагіх будматэрыялаў. Толькі неабходна якасныя — каб пазбегнуць выдаткаў у далейшым. Напрыклад, зносаўстойлівы ламінат, каб праз тры гады яго зноў не прыйшлося мяняць. Ніякай раскошы і выкрутасаў, толькі неабходныя рэчы. Куплялі на будаўнічым рынку, у гандлёвых цэнтрах, нават на «Куфары» — шукалі, дзе танней. Сёе-тое было «не кандыцыя» — напрыклад, у «Кераміне» значна танней прадаецца сантэхніка, якая па некаторых паказчыках не адпавядае крытэрыям якасці. «Эмаль з наплывамі» — вонкава гэта практычна непрыкметна і ад «кандыцыі» амаль не адрозніваецца. Але аказалася, што адрозніваецца. Мы купілі такую ракавіну, «не ліквід» нашай беларускай вытворчасці, за 22 рублі. Танней, чым удваіх схадзіць у «Макдональдс». Але прайшоў год, і цяпер яе выгляд вымушае жадаць лепшага. Не ведаю, ці так выглядала б ракавіна таго ж вытворцы, набытая па нармальнай цане, але мяркую, што ўсё ж яна была б больш зносаўстойлівая.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## МЕРКАВАННЕ ДЫЗАЙНЕРА



**Паступова кватэра становіцца прыдатнай да жыцця, а ідэі ўвасабляюцца ў рэчаіснасць. Але рамонт — гэта сапраўднае выпрабаванне. «У мяне не хапіла б душэўных сіл другі раз прайсці праз гэта», — прызнаецца Ірына.**

***— Наколькі апраўданая купля жылля «пад рамонт» у новабудоўлі або на другасным рынку? Ці сапраўды ў канчатковым выніку на гэтым можна сэканоміць?***

— Усё залежыць ад запытаў чалавека. Кагосьці цалкам задаволіць чыставае адстройванне, якое зробяць будаўнікі, здаючы жыллё «пад ключ», а нехта хоча эксклюзіўны рамонт, — адзначае дызайнер Сяргей Якімовіч. — Што тут можна параіць? Калі ў вас залатыя рукі і рамонтныя работы вам падабаюцца — наперад. Але калі гэта ваш першы рамонт і вы цьмяна ўяўляеце, што вас чакае, працэй спыніцца на кватэры з адстройваннем. У вас застанецца больш сіл, часу і грошай проста на жыццё. Вопыт паказвае: набываючы жыллё з перспектывай сур'ёзнага рамонту, па грашах у канчатковым выніку вы наўрад ці выйграеце.

***— А ці рэальна, ніколі раней з падобнымі работамі не сутыкаючыся, пазбегнуць памылак і не «ўляцець» на бессэнсоўныя расходы?***

— Хутчэй за ўсё, на грошы вы «ўляціце» і памылак вам не пазбегнуць. Напэўна, некалькі разоў вы купіце нешта не тое з будаўнічых матэрыялаў, сантэхнікі і г. д., ёсць верагоднасць, што вы набудзеце будаўнічыя матэрыялы, якія акажуцца недаўгавечнымі, або парушыце тэхналогію, што таксама адаб'ецца на якасці вашага рамонту.

***— Ну, а калі казаць аб куплі кватэры без рамонту на другасным рынку — на што трэба звярнуць увагу? Звычайна вырашаюць усё метраж і лакацыя...***

— «Лішнія» метры лішнімі не будуць ніколі. Вы заўсёды знойдзеце, чым іх запоўніць. Таму я разумею тых, хто ў першую чаргу аддае даніну метражу і рашаецца на рамонт. Але вельмі важна правільна падысці да паняцця «рамонт». Гэта не проста прыгожая карцінка з дызайнерскага часопіса. Гэта старанна прадуманы менавіта пад вашу планіроўку і пад вашы задачы функцыянальны праект, які зробіць жыццё камфортным і пазбавіць ад мноства выдаткаў, матэрыяльных і маральных. І менавіта ў прадуманне такога праекта варта ўкласці сілы, час, а магчыма, і сродкі.

Размяшчэнне кватэры — адзін з галоўных крытэрыяў выбару. Гэтае пытанне трэба добра прадумаць. Дапусцім, у вас маленькія дзеці і сабака — з імі трэба дзесьці гуляць. А вы купляеце кватэру ў цэнтры, дзе побач няма ні парку, ні сквера. З іншага боку, у новых раёнах, як правіла, яшчэ не развіта інфраструктура — трэба будзе чакаць, пакуль пабудуюць дзіцячыя сады, школы, крамы і г. д. А бліжэй да цэнтра горада ўсё гэта ёсць, плюс у старых раёнах больш пенсіянераў, значыць, менш праблем, напрыклад з чаргой у сад. Важна таксама даведацца, ці быў у доме, дзе вы збіраецеся набыць кватэру, капрамонт. Магчымы такі варыянт: вы ўсяліліся, уклаліся ў дызайн кватэры, і праз некалькі гадоў у вашым доме пачынаецца капітальны рамонт — замена стаякоў у ваннай і газавых труб на кухні. Ваш рамонт будзе сапсаваны. Купляючы жыллё «пад рамонт» на другасным рынку, будзьце гатовыя да вялікай колькасці «брудных» работ. Прыйдзецца мяняць праводку, разводку труб водазабеспячэння, цалкам мяняць падлогі, вокны, уваходныя дзверы. Хоць савецкія драўляныя ўваходныя дзверы, на мой погляд, былі вельмі нядрэнныя, моцныя і бяспечныя — калі яны ў добрым стане, такі рарытэт можна пакінуць. Як і чыгунную ванну: калі пакрыць яе эмаллю, яна будзе служыць вам вельмі доўга. Вядома, праблем з другасным жыллём будзе шмат, але калі адзін раз укласці ў яго сілы і сродкі, гэта можа быць нядрэнны варыянт. Ну, і ў старым доме вы адразу бачыце, якія ў вас суседзі. Звярніце ўвагу на стан пад'езда, ліфта, на дваровую тэрыторыю і, вядома, на тых людзей, з якімі вы будзеце кожны дзень вітацца, выходзячы са сваёй кватэры і вяртаючыся дадому, — гэта таксама немалаважны крытэрый.

## ПАДВЯДЗЁМ ВЫНІКІ

• Рамонтныя работы, хутчэй за ўсё, абыдуцца вам прыкладна ў тую суму, якую вы сэканомілі, набываючы кватэру з перспектывай рамонту. Нават пры ўліку, што ў вас ёсць інструменты і хоць бы мінімальныя веды і навыкі, майце на ўвазе, што падчас самастойнага рамонту пэўны час і грошы хутчэй за ўсё сыдуць на памылкі і іх выпраўленне.

— Напрыклад, спецыяліст рэкамендаваў нам купіць змеявік пэўнага памеру ў ванную, — гаворыць Ірына. — Па факце, змеявік гэты быў на 10 сантыметраў шырэйшы, чым патрэбна, спецыяліст аказаўся не спецыялістам, а мы страцілі час і грошы.

• Да самастойнага рамонту трэба быць маральна гатовымі. Цалкам верагодна, што ён расцягнецца на нявызначаны тэрмін. Калі вы хочаце ўсё зрабіць «з наскоку», вам трэба мець у запасе адпаведную суму і наймаць спецыялістаў. Хоць і з брыгадай можа не пашанцаваць.

— Наш рамонт доўжыцца ўжо больш за год. Але мы займаемся ім па вечарах пасля работы, у выхадныя, у адпачынку. І самае галоўнае — калі ёсць грошы. Вельмі шмат работ спынена, таму што няма магчымасці купіць неабходныя матэрыялы. Але калі нічым, акрамя рамонту, больш не займацца, то самастойна яго можна завяршыць за паўгода, — кажа Чэслаў.

• Каб пачынаць такі маштабны праект, як самастойны рамонт, трэба быць альбо вельмі ўмелым, альбо вельмі амбіцыйным і мэтанакіраваным чалавекам, гатовым да цяжкай працы, адсутнасці выхадных і бытавой неўладкаванасці на некалькі гадоў.

— Напэўна, я не адважылася б на такую авантуру зноў, — прызнаецца Ірына. — У мяне не хапіла б душэўных сіл другі раз прайсці праз гэта.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)




## МУЗЫКА РОБІЦЬ ЦУДЫ!

У 1974 годзе работнікі Гомельскага хімзавода атрымалі шыкоўны падарунак: у іх (і не толькі...) з'явіўся свой Палац культуры, а значыць — магчымасць займацца ў шматлікіх творчых гуртках, ды што там — нават выходзіць на вялікія сцэны (як той жа спявак Ухцінскі)...

А ўсё чаму? Таму што пачаткоўцаў (і дзяцей, і дарослых) было каму падтрымаць. Тут і цяпер я хацеў бы вылучыць толькі аднаго мастацкага кіраўніка — пастаноўшчыка танцаў Яфіма Геніна і толькі аднаго з выканаўцаў — апаратчыка сернакіслотнага цэха Васіля Глушакова. Штогод напярэдадні свят у палацы праходзілі святочныя вечары: пачыналіся — з урачыстых сходаў, завяршаліся танцамі, а пасярэдзіне быў канцэрт з незаменным цвіком праграмы...

Ну вось убачце: адкрываецца заслона. За ёй у крэсле сядзіць бабуля. На каленях у яе клубок нітак, у руках — пруткі. Яна (а папраўдзе — «прыбраны» ў бабульку спадар Васіль) нешта «вяжа».

Праз імгненні побач з'яўляецца «ўнучка» і выдае папулярнае тады:

*Бабушка,*
*отложи ты вязанье,*
*Заведи*
*старый свой граммофон*
*И моё ты исполни*
*желанье:*
*Научи*
*танцевать чарльстон.*

«Бабуля» спярша вагаецца: і згадзіцца як быццам не можа, і адмовіць не хоча... А таму «са скрыпам», ледзьледзь падымаецца з крэсла, сагнуўшыся ў тры пагібелі, падыходзіць да «грамафона», уключае музыку (у зале і сапраўды чуецца шыпенне кружэлкі, гучаць першыя акорды чарльстона) — «бабуля» з «унучкай» пачынаюць танцаваць. Адзінае — спярша не зразумець, хто каго вучыць, бо ў «настаўніцы» рухі ну вельмі няўклюдныя, нават непрыгожыя... Але музыка робіць цуды: «бабуля» на вачах маладзее, спрытнее і пачынае выкідваць ну такія каленцы...

Публіка заходзіцца ад рогату, падбадзёрвае танцорак, адбівае рукі ў апладысментах!

...На мяжы стагоддзяў хімзавод перажываў не найлепшыя часы. Палац — цяпер ён «Фестывальны» — даволся перадаць на баланс горада. Але ж для ветэранаў ён паранейшаму іхні.

І там, калі напружыць памяць, бабуля з унучкай па-ранейшаму станцуюць чарльстон.

**Мікалай Старых,**
*г. Гомель.*

## СУКЕНКІ БУДУЦЬ НОВЫЯ...

Для таго каб наплылі, накрылі з галавой успаміны, часам трэба зусім няшмат: вухам злавіць мелодыю. Ну вось нядаўна загучаў па радыё вальс «Бярозка» і, можна сказаць, «падхапіў» мяне — занёс у самыя шчаслівыя гады, у маю маладосць. Там была фабрыка, быў дружны калектыў, Дом культуры з пастаяннай выстаўкай узораў нашых тканін, якія ішлі на экспарт, і з картай свету, дзе пазначалася, куды канкрэтна... Як зараз бачу: там — безліч лямпачак, безліч «адрасоў»! Ну чым не падстава для гонару?! Як, зрэшты, і для смутку, бо мы самі гэтых тканін купіць не маглі... Хіба аднойчы?

Маланкай, помню, праляцела чутка, што ў продаж выкінулі (тады так казалі) наш паркаль — прыгожы-прыгожы, ну быццам з той выстаўкі! Мы — бягом



у краму. Адстаялі чаргу, нахапалі таго паркалю — хто на сукенку, а хто і на дзве... Заставалася толькі пашыць.

А тут якраз і стымул: аб'ява, што праз месяц паркалёвы баль адбудзецца, прычым — з конкурсам на самую прыгожую сукенку! І з танцамі — у Доме культуры... Дзе люстры зззяюць! Дзе паркет! Дзе жывая музыка... Гэта ж вам не пласцінкі ў чырвоным кутку! Баль ёсць баль, карацей! Свята!

У «рамках падрыхтоўкі» да яго мы кінуліся ў атэлье, для таго каб новыя сукенкі пашыць. А там — ад варот паварот: чарга даўжэзная!

Мы давай тады швачак-надомніц шукаць, выбіраць фасоны. Вядома ж, не з замежных часопісаў, а так: спаднічкі — у складачку, у зборачкі альбо паўклёш, рукаўчыкі — ліхтарыкам або крыльцам, выраз ля шыі — па фантазіі швачкі (гэткія «дэкальтэ», як цяпер, нам нават не сніліся)...

Карацей, сукенак мы ўсё ж нашылі.

І вось ён, баль!

Хлопцаў на ім зусім нямнога: трохі наладчыкаў прадзільных машын ды ткацкіх станкоў, трохі запрошаных салдат з падшэфнай воінскай часці, а вось дзяўчат — проста мора! І адна прыгажэйшая за другую: маладзенькія, стройныя, у новых сукеначках, туфлях-лодачках... Журы — ну зусім разгубілася: хіба ў гэтым кветніку можна некага выбраць?! Са смехам аб'явілі, што падзелу — на лепшых і самых лепшых — сення не будзе...

У адказ проста шквал апладысментаў: «Правільна!»

А далей — зноўку танцы...

Але ж і яны ўрэшце канчаюцца. Мы выходзім на вуліцу, а там — дождж. І досыць спорненькі. Таму я, пакуль прыбегла ў інтэрнат, прамокла да ніткі! Потым ціхенька зайшла ў свой пакой, не ўключаючы святла, раздзелася (сукенку ўскінула на спінку ложка), да раніцы соладка праспала (ведама, натанцаваўшыся).

А назаўтра ўстаю — усе дзяўчаты ў рогат: пальцамі на мяне паказваюць і аж заходзяцца... «З чаго?» — пытаюся. Яны адказаць не могуць.

Здагадалася — паглядзела на сябе і вачам не паверыла: усё цела ў «кветачках», у рознакаляровых плямах і разводах: карціна алеем, можна сказаць! Такую і Далі б не прыдумаў!

Адкуль яна, здагадацца было няцяжка. Ды і дзяўчаты сказалі: яны, трохі старэйшыя, ужо ведалі, што ў краме прадаюць хіба тыя з нашых тканін, якія забракавалі аптавікі.

...Шкада мне было сукенкі: толькі раз у ёй пафарсіла і ўсё: фарба аблезла, малюнкі размыліся...

Але ж помніцца не столькі гэта, колькі само чаканне балю, зборы, хваляванне, танцы пад жывую музыку, вальс «Бярозка» ды вясёлы смех дзяўчат. А потым — і мой, бо не гараваць жа мне па сукенцы? Яна ж — справа нажыўная!

І сапраўды, колькі іх потым было — сукенак, касцюмаў, спадніц, сарафанаў... І прыгажэйшых, і даражэйшых... Але ж помніцца чамусьці тая — паркалёвая.

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

## ЗЛОДЗЕЮ ДАСТАТКОВА...

### Хоць і не кожнаму

У маёй бабулі Марыі Іванаўны жыццё было — не пажадаеш ворагу. Днём яна арала, жала, касіла, палола... А па начах, можна сказаць, шыла, вязала, варыла, абмывала сям'ю. Ды ў сезон яшчэ хадзіла ў калгасны свіран веяць ды сушыць збажыну.

За работу грошай тады не плацілі. Выжыць, не памерці з галадухі, дапамагала хатняя гаспадарка. Але ж у тыя пасляваенныя часы сялян душылі падаткамі: дзяржаве трэба было здаваць і мяса, і малако, і сала, і яйкі. Ды што там — падатак вымагаўся нават за кусты і дрэвы. А калі нехта не мог сплаціць, у двор прыходзілі так званыя ўпаўнаважаныя і нешта забіралі — карову, свінню...

Я гэта да таго, што людзей проста вымушалі красці.

Вось і бабуля, калі па вечарах ішла працаваць, брала з сабой невялічкую палатняную торбачку, у якую насыпала крыху зерня і хавала пад сарочку. Бывала — і дадому яе данясе, а бывала — брыгадзір калгасны зловіць, прымусіць высыпаць ды яшчэ і напалохае... Хоць турмы і без таго баяліся, бо садзілі тады (часам — аж на 10 гадоў!) ні за што — за каласкі, сабраныя на ржышчы...

Але ж голад быў мацнейшы за страх. І таму назаўтра бабуля зноў брала торбачку, зноў насыпала зерня. А потым, калі пашчасціць данесці, таўкла яго ў ступе, пякла аладкі, рабіла клёцкі, варыла ячменны кісель. Ратавала сваю сям'ю.

Вось і ў тую ноч, калі работа была ўжо скончана і свіран замкнуты, яны з сяброўкай схаваліся за вугал, пачакалі, пакуль з'ехаў брыгадзір, адсунулі дошку, якую адарвалі загадзя, — залезлі ў памяшканне.

Там вельмі цёмна было, аднак жанчыны хуценька «адшукалі» кучу з зернем, насыпалі свае торбачкі і ўжо збіраліся вылазіць назад, як раптам знадворку пачуўся нейкі рух... Хтосьці... адмыкаў (?!) дзверы...

Жанкі з тога жаху забіліся ў самы дальні кут. І ўжо адтуль (ім месяц пасвяціў) убачылі, як дзверы адчыніліся, як у свіран зайшоў... брыгадзір: хуткім крокам рушыў да мяшкоў з зернем, адзін закінуў на плечы, панёс да выхаду, дзе стаяла падвода, вярнуўся па другі...

Жанчыны не верылі сваім вачам: брыгадзір, які за жменю зерня іншых пужаў турмою, сам крадзе мяхамі?!

...Іх, тыя мяшкі, ён акуратна злажыў на воз, дзверы замкнуў і паехаў сабе дамоў.

Бабуля, паглядзеўшы на гэта, сказала сяброўцы: «Калі можна красці яму, то, далібог жа, не грэх і нам!»

Да раніцы на плячах яны цягалі зерне.

Назаўтра брыгадзір заўважыў яго недастачу, аднак шуму падымаць не стаў, нават памякчэў крыху. Не інакш, зразумеў, што яго ў тую ноч нехта бачыў. А гэтага, як высвятляецца, можа быць дастаткова.

**Вольга Федзяшына,**
*г. Слуцк.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***АД ЯЕ Ж** і, мусіць, яшчэ раз. Гісторыі, паводле слоўніка эпітэтаў беларускай літаратурнай мовы, бываюць абсурдныя, амурныя, анекдатычныя, банальныя, абуральныя, дзівосныя, ідыёцкія, камічныя, крановальныя, павучальныя, скандальныя, трагікамічныя... Усяго — ці паверыце? — каля сотні слоў!*

*І яшчэ адна лічба (мо такая ж неверагодная): газета «Звязда» іх збірае амаль дваццаць гадоў.*

*Удзячная справа! А таму — далучайцеся. Гэта значыць, пішыце (калі ласка, з нумарам тэлефона для аператыўнай зваротнай сувязі)! Быць не можа, каб у вашым жыцці не было нічога, што варта было б расказаць!*

Неасабісты суб'ектыў



# МАСАЧНЫ РЭЖЫМ

### Што і каму мы павінны ў гэтым жыцці

СЁННЯ навіна дня — у Мінску ўведзены абавязковы масачны рэжым. Усе ходзяць, абмяркоўваюць, разважаюць, ці трэба сядзець у той масцы, калі ты адзін у кабінеце. Настрой пануе хутчэй легкадумны, такое ўражанне, што нікога гэта паведамленне асабліва не закранула. Вось каб вясной, на пачатку эпідэміі, яго абвясцілі — тады быў бы гвалт і аларм. Усе б кінуліся па маскі, якія тады пэўны час былі ў дэфіцыце, пэўна, нехта б з некім пасварыўся ці пабіўся, навінавыя сайты стракацелі б інфармацыяй пра дэфіцыт, пра цэны, пра тое, што робіцца і не робіцца, каб збіць ажыятаж... А цяпер што — нецікава зусім — маскі аднаразовыя і шматразовыя розных колераў і фасонаў прадаюцца не тое што ў крамах і аптэках — у шапіках на прыпынках. Купіў, надзеў, пайшоў далей. Справы ўсяго на дзве хвіліны, і праблем з выкананнем вымушана ўведзенага рэжыму пагалоўна ўсімі насельнікамі і гасцямі сталіцы быць не павінна.

Але — і кіньце ў мяне камянюкай, калі гэта не так — я ўпэўнена, што праблемы будуць. Калі яшчэ можна ўявіць, што без маскі ў метро ці магазін чалавека проста не пусціць ахова, дык як быць з тралейбусамі і аўтобусамі (асабліва ў час пік)? Спадзявацца на тое, што ўсе раптам уключаць калі не грамадскую свядомасць, дык інстынкт самазахавання, неяк сёння не даводзіцца. Магчыма, іх дапамаглі б уключыць штрафы, як напрыклад, у Германіі, дзе за з'яўленне без маскі ў грамадскім месцы заплаціш 50 еўра і больш. Але ж у нас пакуль што штрафы не прадугледжаны, і толькі ўрачы нясмела так гавораць пра найгоршыя санкцыі, якія мы выстаўляем сабе самі, — верагоднасць заразіцца абсалютна непрадказальнай немаччу і заразіць сваіх блізкіх. Але ці многія іх, урачоў, чуюць?

НЯДАЎНА давялося ў будны дзень ехаць на прыгарадным «дачным» аўтобусе на Мінск. Пасля абеду на ім вяртаюцца са сваіх участкаў пенсіянеры, маладзейшыя людзі ў гэты час вялікая рэдкасць. Тым разам з маладзейшых ехалі толькі я ды жанчына з велікаватай ужо дзяўчынкай гадоў дзесяці. І маці, і дачушка былі без масак. Гэта стала вельмі заўважна, калі на прыпынках пачалі заходзіць пажылыя дачнікі. Вы не паверыце, але гэта сапраўды так — ва ўсіх былі закрытыя маскамі твары. Калі іх стаў амаль цэлы аўтобус, маці з дачкой на фоне гэтага лакальнага масачнага рэжыму глядзеліся як белыя вароны. Бабулі і дзяды кідалі на іх дакорлівыя позіркі, але вы думаеце, іх гэта збянтэжыла? Яны гучна размаўлялі, смяяліся, малая яшчэ і раз-пораз кашляла, нават не прыкрываючыся далонню. Калі ж нарэшце адна пажылая жанчына вельмі ветліва папрасіла або надзець маскі, або хаця б памаўчаць, маладзіца выдала ёй у твар цэлую тыраду. Калі пераказваць коратка — мне той вірус па барабане, я маладая, ні мяне, ні дачку халера не возьме. А што магу вас заразіць — дык я вам нічога не павінна і ўвогуле нікому тут нічога не павінна. Баіцеся — адыдзіце далей. А мы як ехалі, так і паедзем згодна з купленымі білетамі.

Я гэту асобу даволі добра ведаю, яна ў недалёкай ад маёй вёсцы садзілася ў аўтобус, пажылы бацька яе праводзіў, пяшчотна так унучку цалаваў. Хацела ёй штосьці сказаць у адказ, але што? Яна ж мне сапраўды нічога не павінна, а заклікаць чужога па сутнасці чалавека да сумлення — мы для гэтага надта далікатныя. Што само па сабе нядрэнна. З гэтымі думкамі я толькі ўнурыла твар пад маскай яшчэ і ў каўнер і неяк даехала да горада.

МЫ сапраўды нічога нікому не павінны. Але ж многія з нас так доўга апошнім часам расказвалі самім сабе, якія мы неверагодныя, як нават падчас масавых хаджэнняў па сталіцы здымаем абутак, калі становімся на лаўку, і прыбіраем пасля сябе смецце, якія мы салідарныя, як адно аднаго падтрымліваем. Куды ж тады дзеяцца наша неверагоднасць, калі мы спускаемся ў метро без маскі, размаўляем, смяёмся з сябрамі (я перш за ўсё маладых людзей маю на ўвазе, якія гэтай самай уласнай неверагоднасцю больш за ўсё і цешацца). Такія прыгожыя, упэўненыя ў сабе, і мы нічога не баімся, і мы крутыя, не тое, што гэтыя дзівакі са схаванымі па самыя вочы тварамі. (Кожны, хто ездзіў у мінскім метро, не сумняваюся, лавіў на сабе позіркі хлопцаў і дзяўчат, у якіх гэта чыталася.) А што ў сябра ці проста ў таго незнаёмага хлопца, які едзе побач у вагоне, бабуля заўтра трапіць з цяжкім паражэннем лёгкіх у рэанімацыю — дык гэта не мы. Гэта не наша зона адказнасці. І да нашай неверагоднасці, чалавечнасці, сумленнасці гэта ніякіх адносін не мае...

ВОСЬ я, магчыма, дрэнна пра нас усіх думаю, але здаецца, што ўвядзенне масачнага рэжыму мала што зменіць. Пакуль у нас саміх нешта ў галаве не шчоўкне. А шчоўкае яно, як правіла тады, калі закранае асабіста. Я нездарма прыгадала той выпадак у аўтобусе. Знаёмыя сярод навін нашага вясковага наваколля расказалі пра бацькоў той маладзіцы, якіх пазаўчора абаіх з пнеўманіяй забрала «хуткая». Я ўвогуле чалавек не злы, але вельмі хацелася б сёння пачуць ад яе, што і каму яна павінна.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Празднуйте вместе!»

Настоящие правила проведения Рекламной игры **«Празднуйте вместе!»** (далее – Правила), разработаны в соответствии с Положением «О проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь», утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения на территории Республики Беларусь Рекламной игры **«Празднуйте вместе!»** (далее – Рекламная игра).

**1. Общие положения:**

1.1. **Организатор Рекламной игры:** белорусско-эстонское совместное предприятие «ПРАЙМЭРИ» общество с ограниченной ответственностью (далее – «Организатор») с местом нахождения по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2. УНП101132766. Электронный адрес: igra@primary-jwt.by.

1.2. **Наименование Рекламной игры: «Празднуйте вместе!»**

1.3. **Территория проведения Рекламной игры**: Республика Беларусь.

1.4. **Срок начала и окончания Рекламной игры**, включая срок выдачи выигрышей и публикации результатов проведения Рекламной игры: с 16.11.2020 г. по 15.01.2021 г.

1.5. **Период, в течение которого можно стать Участником Рекламной игры**: с 16 ноября 2020 г. по 31 декабря 2020 г. включительно.

1.6. **Состав комиссии по проведению Рекламной игры** (далее – Комиссия):

Председатель комиссии:

• Куянцев Игорь Юрьевич, заместитель директора СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

Члены комиссии:

• Шиманко Анастасия Александровна, ведущий специалист по работе с клиентами СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

• Абрамович Татьяна Владимировна, специалист по работе с клиентами СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

• Беляев Никита Юрьевич, специалист по медиапланированию Иностранного унитарного предприятия «Медиахауз»;

• Головач Светлана Александровна, специалист по работе с клиентами СП «ПРАЙМЭРИ» ООО.

**1.7. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:** рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации следующих товаров (по тексту Правил – Игровой продукт):

• Корм консервированный полнорационный для кошек/котят, производимый под товарным знаком Whiskas, масса нетто 85 грамм (в любом ассортименте).

• Корм консервированный полнорационный для кошек/котят, производимый под товарным знаком Sheba Pleasure, масса нетто 85 грамм (в любом ассортименте).

• Корм консервированный полнорационный для собак/щенков, производимый под товарным знаком Pedigree, масса нетто 85 грамм (в любом ассортименте).

• Корм консервированный полнорационный для кошек/котят, производимый под товарным знаком Kitekat, масса нетто 85 грамм (в любом ассортименте).

• Лакомства для кошек, производимые под товарным знаком Dreamies, масса нетто 30 грамм, 60 грамм (в любом ассортименте).

• Лакомства для собак, производимые под товарным знаком Pedigree, масса нетто 110 грамм, 180 грамм, 270 грамм (в любом ассортименте).

**2. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Рекламной игры:**

2.1. К участию в Рекламной игре допускаются достигшие возраста 14 лет физические лица – граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, постоянно проживающие в Республике Беларусь (имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь).

2.2. Участником Рекламной игры не может быть член комиссии по проведению Рекламной игры, а также лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

2.3. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

2.4. Для участия в Рекламной игре необходимо в период времени с 16 ноября 2020 г. по 31 декабря 2020 г. (включительно):

2.4.1. Приобрести в объектах розничной торговли на территории Республики Беларусь любой игровой продукт, указанный в п. 1.7. Правил, на общую сумму в одном товарном чеке 5 (пять) и более белорусских рублей.

Под «чеком» в настоящих Правилах понимается документ, подтверждающий факт приобретения Игровых продуктов, который должен содержать сведения об УНП (учетном номере налогоплательщика) продавца, дате продажи, наименовании, количестве и цене товара, сумме покупки.

2.4.2. Пройти регистрацию Участника на сайте www.whiskas-promo.by (далее – Сайт). Для регистрации Участника на Сайте ему необходимо заполнить следующие свои данные в соответствующих полях регистрационной формы на Сайте: личный номер мобильного телефона оператора сотовой связи Республики Беларусь, услугами которого пользуется Участник, с указанием мобильного оператора (МТС, A1, Life:)), имя, фамилию, отчество, адрес фактического проживания Участника, адрес электронной почты Участника, а также подтвердить свое согласие с настоящими Правилами путем проставления галочки в специальном окне Сайта. После выполнения указанных действий на странице Сайта выпадает окно «Сообщение с кодом отправлено на Ваш номер». Автоматически на соответствующий номер мобильного телефона Участника, указанный им при регистрации, отправляется короткое сообщение, состоящее из 4 цифровых символов. После ввода полученного цифрового кода в соответствующее поле регистрационной формы «Введите код», Участник подтверждает заполненую форму и завершает регистрацию. В случае успешной регистрации Участника на Сайте выводится соответствующее сообщение. Регистрация Участника на Сайте производится только один раз за период проведения рекламной игры.

2.4.3. Зарегистрировать чек на Сайте в поле «Регистрация покупки», прикрепив фотографию чека.

Чек считается зарегистрированным в момент загрузки прикрепленной фотографии чека на Сайте.

2.5. Количество участий в Рекламной игре одного Участника – не ограничено.

2.6. Один и тот же номер мобильного телефона может быть использован для регистрации покупок только одного Участника.

**3. Состав и размер призового фонда и источники его формирования:**

3.1. Призовой фонд Рекламной игры формируется Организатором в размере 20 700,00 (двадцать тысяч семьсот) белорусских рублей и 00 копеек. Источником формирования призового фонда является имущество Организатора.

3.2. Призовой фонд Рекламной игры включает в себя призы (выигрыши), перечисленные ниже в Таблице № 1.

Таблица № 1: Призовой фонд Рекламной игры.

| | Наименование призов | Количество, шт. | Цена за 1 единицу, бел. руб. | Всего, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **ПРИЗ 1:** электронный подарочный сертификат 21vek+, стоимостью 20,00 (двадцать) белорусских рублей, действительный до 19.10.2021 г. **Далее – ПРИЗ 1** | 230 | 20,00 | 4 600,00 |
| 2. | **ПРИЗ 2:** электронный подарочный сертификат 21vek+, стоимостью 50,00 (пятьдесят) белорусских рублей, действительный до 19.10.2021 г. **Далее – ПРИЗ 2** | 138 | 50,00 | 6 900,00 |
| 3. | **ПРИЗ 3:** электронный подарочный сертификат 21vek+, стоимостью 100,00 (сто) белорусских рублей, действительный до 19.10.2021 г. **Далее – ПРИЗ 3** | 92 | 100,00 | 9 200,00 |

**4. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения Победителей:**

4.1. Розыгрыши призов проводятся в офисе Организатора по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2.

4.2. Розыгрыши всех призов проводятся согласно Таблице 2 среди Участников, которые, выполнив условия участия в Игре, зарегистрировали чеки на Сайте в соответствующий период времени.

Таблица № 2. Розыгрыши призов.

| № | Дата и время розыгрыша | Розыгрыши проводятся среди Участников, которые зарегистрировали на Сайте чеки в период |
|---|---|---|
| 1 | 17 ноября 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 16 ноября по 23:59:59 16 ноября 2020 г. |
| 2 | 18 ноября 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 17 ноября по 23:59:59 17 ноября 2020 г. |
| 3 | 19 ноября 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 18 ноября по 23:59:59 18 ноября 2020 г. |
| 4 | 20 ноября 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 19 ноября по 23:59:59 19 ноября 2020 г. |
| 5 | 23 ноября 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 20 ноября по 23:59:59 20 ноября 2020 г. |
| 6 | 23 ноября 2020 г. в 15:20 | с 00:00:00 21 ноября по 23:59:59 21 ноября 2020 г. |
| 7 | 23 ноября 2020 г. в 15:40 | с 00:00:00 22 ноября по 23:59:59 22 ноября 2020 г. |
| 8 | 24 ноября 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 23 ноября по 23:59:59 23 ноября 2020 г. |
| 9 | 25 ноября 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 24 ноября по 23:59:59 24 ноября 2020 г. |
| 10 | 26 ноября 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 25 ноября по 23:59:59 25 ноября 2020 г. |
| 11 | 27 ноября 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 26 ноября по 23:59:59 26 ноября 2020 г. |
| 12 | 30 ноября 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 27 ноября по 23:59:59 27 ноября 2020 г. |
| 13 | 30 ноября 2020 г. в 15:20 | с 00:00:00 28 ноября по 23:59:59 28 ноября 2020 г. |
| 14 | 30 ноября 2020 г. в 15:40 | с 00:00:00 29 ноября по 23:59:59 29 ноября 2020 г. |
| 15 | 01 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 30 ноября по 23:59:59 30 ноября 2020 г. |
| 16 | 02 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 01 декабря по 23:59:59 01 декабря 2020 г. |
| 17 | 03 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 02 декабря по 23:59:59 02 декабря 2020 г. |
| 18 | 04 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 03 декабря по 23:59:59 03 декабря 2020 г. |
| 19 | 07 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 04 декабря по 23:59:59 04 декабря 2020 г. |
| 20 | 07 декабря 2020 г. в 15:20 | с 00:00:00 05 декабря по 23:59:59 05 декабря 2020 г. |
| 21 | 07 декабря 2020 г. в 15:40 | с 00:00:00 06 декабря по 23:59:59 06 декабря 2020 г. |
| 22 | 08 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 07 декабря по 23:59:59 07 декабря 2020 г. |
| 23 | 09 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 08 декабря по 23:59:59 08 декабря 2020 г. |
| 24 | 10 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 09 декабря по 23:59:59 09 декабря 2020 г. |
| 25 | 11 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 10 декабря по 23:59:59 10 декабря 2020 г. |
| 26 | 14 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 11 декабря по 23:59:59 11 декабря 2020 г. |
| 27 | 14 декабря 2020 г. в 15:20 | с 00:00:00 12 декабря по 23:59:59 12 декабря 2020 г. |
| 28 | 14 декабря 2020 г. в 15:40 | с 00:00:00 13 декабря по 23:59:59 13 декабря 2020 г. |
| 29 | 15 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 14 декабря по 23:59:59 14 декабря 2020 г. |
| 30 | 16 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 15 декабря по 23:59:59 15 декабря 2020 г. |
| 31 | 17 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 16 декабря по 23:59:59 16 декабря 2020 г. |
| 32 | 18 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 17 декабря по 23:59:59 17 декабря 2020 г. |
| 33 | 21 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 18 декабря по 23:59:59 18 декабря 2020 г. |
| 34 | 21 декабря 2020 г. в 15:20 | с 00:00:00 19 декабря по 23:59:59 19 декабря 2020 г. |
| 35 | 21 декабря 2020 г. в 15:40 | с 00:00:00 20 декабря по 23:59:59 20 декабря 2020 г. |
| 36 | 22 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 21 декабря по 23:59:59 21 декабря 2020 г. |
| 37 | 23 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 22 декабря по 23:59:59 22 декабря 2020 г. |
| 38 | 24 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 23 декабря по 23:59:59 23 декабря 2020 г. |
| 39 | 28 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 24 декабря по 23:59:59 24 декабря 2020 г. |
| 40 | 28 декабря 2020 г. в 15:20 | с 00:00:00 25 декабря по 23:59:59 25 декабря 2020 г. |
| 41 | 28 декабря 2020 г. в 15:40 | с 00:00:00 26 декабря по 23:59:59 26 декабря 2020 г. |
| 42 | 28 декабря 2020 г. в 16:00 | с 00:00:00 27 декабря по 23:59:59 27 декабря 2020 г. |
| 43 | 29 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 28 декабря по 23:59:59 28 декабря 2020 г. |
| 44 | 30 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 29 декабря по 23:59:59 29 декабря 2020 г. |
| 45 | 31 декабря 2020 г. в 15:00 | с 00:00:00 30 декабря по 23:59:59 30 декабря 2020 г. |
| 46 | 04 января 2021 г. в 15:00 | с 00:00:00 31 декабря по 23:59:59 31 декабря 2020 г. |

В каждом розыгрыше разыгрываются призы в следующей последовательности: ПРИЗ 1 – 5 штук; ПРИЗ 2 – 3 штуки; ПРИЗ 3 – 2 штуки.

4.3. До начала каждого розыгрыша Комиссия составляет списки Участников, имеющих право участвовать в соответствующем розыгрыше, с указанием Порядкового номера регистрации, фамилии, имени, отчества Участников, а также даты и времени регистрации чека на Сайте.

Порядковый номер регистрации присваивается каждому зарегистрированному чеку Участника в хронологическом порядке в зависимости от даты и времени регистрации чека на Сайте.

4.4. Для каждого розыгрыша призов Организатором используется лототрон и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 по 9. Определение выигрышных номеров получателей призов происходит путем их формирования справа налево из номеров шаров, поочередно извлекаемых из барабана.

Для определения цифры первого справа разряда выигрышного порядкового номера, помещаются в лототрон шары с номерами от 0 по первую справа цифру последнего порядкового номера Участника игры в списке. Из барабана извлекается один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый справа разряд формируемого выигрышного номера. После этого в барабан загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из барабана извлекается шар, номер которого определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Номер шара вносится в протокол, в соответствующий разряд выигрышного номера.

Подобным образом шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон соответствующих разрядов порядковых номеров в списке Участников.

Участник, на чей зарегистрированный порядковый номер регистрации приходится сформированный выигрышный номер, является Победителем, имеющим право на получение соответствующего приза.

Таким образом определяются Победители всех розыгрышей.

Каждый Участник может выиграть не более одного ПРИЗА 1, не более одного ПРИЗА 2, не более одного ПРИЗА 3 за весь период Рекламной игры.

В случае если в ходе розыгрышей на данного Участника (Победителя) приходится повторный выигрыш приза, который он уже выигрывал ранее в ходе настоящей Рекламной игры, то данному Участнику выигрыш не выдается, а для определения Участника, имеющего право на получение этого выигрыша, проводится повторный розыгрыш в порядке, предусмотренном п. 4.4. Правил.

**5. Срок и способ информирования Победителей:**

5.1. Победители извещаются о выигрыше посредством отправки SMS-сообщения на номер мобильного телефона Победителя, указанный им при регистрации на Сайте, в срок не позднее 05 января 2021 года. Также Организатор оставляет за собой право дополнительно уведомлять Победителей любым удобным ему способом: телефонным звонком, почтовым отправлением и др.

**6. Место, порядок и срок выдачи выигрышей:**

6.1. Призы выдаются Победителям в срок не позднее 15 января 2021 г. путем направления соответствующих Электронных подарочных сертификатов в виде ссылки, доступной для скачивания, с адреса электронной почты Организатора igra@primary-jwt.by на адрес электронной почты Победителя, указанный им при регистрации на Сайте согласно п. 2.4.2. Правил.

Подробная информация об использовании Электронных подарочных сертификатов размещена на сайте: https://www.21vek.by/special_offers/gift_certificate.html

В целях налогового контроля, в случае выигрыша одним Участником призов на общую сумму 140 рублей и более, перед получением выигрыша Участник обязан направить на адрес электронной почты Организатора igra@primary-jwt.by сфотографированные страницы 31–33 своего паспорта или вида на жительства, а также страницу с указанием адреса регистрации Участника.

6.2. Призы не подлежат выдаче Участнику иначе как в порядке, предусмотренном Правилами. В случае отказа Участника от получения приза, невыполнения Участником требований настоящих Правил или неполучения им приза в установленные сроки и в установленном порядке, Участник теряет право на получение приза, и причитающийся Победителю приз остается у Организатора.

**7. Прочие условия:**

7.1. Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

7.2. Результаты проведения Рекламной игры публикуются в газете «Звязда» не позднее 12 января 2021 г.

7.3. Информацию о Правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на Сайте www.whiskas-promo.by, а также по телефону горячей линии (телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры): +375 17 239 07 17 с 10.00 до 18.00 часов ежедневно без выходных. Звонок платный, в соответствии с тарифами операторов, которыми пользуется Участник.

7.4. Организатор не несет ответственности за:

7.4.1. Ошибки, допущенные Участниками Рекламной игры и за достоверность сведений и персональных данных, указанных Участниками при регистрации.

7.4.2. Невозможность связаться с Участником в случае недостоверности информации, предоставленной Участником.

7.4.3. Невыполнение (несвоевременное выполнение) Участниками обязанностей, связанных с участием в Рекламной игре и получением призов.

7.4.4. Неознакомление Участников с настоящими Правилами и условиями участия в Рекламной игре, а равно их неознакомление с результатами проведения Рекламной игры.

7.4.5. Неполучение (несвоевременное получение) от Участников документов и/или сведений, необходимых для получения призов.

7.4.6. За работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети Интернет Участнику) и операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д.).

7.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

7.6. Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору.

7.7. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Рекламной игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

*Свидетельство № 3883 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 09 ноября 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

## Извещение о проведении 03 декабря 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Здание весовой АБЗ «Заславль» общей площадью 29,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-122807 (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой АБЗ «Заславль» с навесом 1, забором а1, металлическим ограждением площадки для стоянки автомобилей а2, асфальтная площадка на АБЗ «Заславль» а3, технологическая площадка по хранению и обработке материалов а4) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 2,2169 га, кадастровый номер – 623650100001005211 |
| Местонахождение – Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/1 |
| Начальная цена – 1 591 507,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 159 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **03 декабря 2020 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 16.11.2020 по 01.12.2020 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

13 лістапада 2020 г. № 43 (579)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ПРОСЬБЫ, ПРАПАНОВЫ, ПАДЗЯКІ...

## Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла прамую лінію

**Трэба сказаць, звычайна ў гэты дзень тэлефон у яе рабочым кабінеце не змаўкае ні на хвіліну — ахвотных расказаць асабіста спікеру верхняй палаты парламента аб тым, што хвалюе, з кожным разам менш не становіцца. І гэта добра — веданне таго, з якімі праблемамі сутыкаюцца жыхары таго ці іншага рэгіёна, дазваляе рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання адэкватна рэагаваць на патрэбы і запыты людзей на месцах.**



Фота БелТА.

У асноўным тэматыка зваротаў застаецца нязменная: зямельныя і камунальна-бытавыя пытанні складаюць «касцяк» усіх праблем, з якімі звяртаюцца заяўнікі. Напрыклад, 75-гадовую пенсіянерку з Бабруйска Эму Іванаўну непакоіць тое, што на зямлі, якой яна валодае ў вёсцы Вінаградаўка Сычкаўскага сельсавета, пакуль немагчыма пабудаваць жыллё. Жанчына пераканана, што яе спадчыннікі ў будучым хацелі б гэта зрабіць, але мясцовыя ўлады адмаўляюць з нагоды таго, што, маўляў, участак будзе выкарыстоўвацца не па прызначэнні.

З крыху іншай праблемай, але ўсё ж таксама па зямлі, да старшыні Савета Рэспублікі звярнуўся фермер з Дзяржынскага раёна. Ён расказаў, што ў свой час узвёў дзве пабудовы на сваім участку ў вёсцы Каменка Негарэльскага сельсавета, але са змяненнем нормаў адпаведнага заканадаўства трапіў у непрыемнае становішча: вось ужо пяць гадоў не можа ўзаконіць гэтыя будынкі.

> Канешне, не ўсе пытанні, з якімі звяртаюцца грамадзяне, можна вырашыць адразу. Некаторыя з іх патрабуюць дэталёвай прапрацоўкі з зацікаўленымі і застаюцца на кантролі ў Савеце Рэспублікі.

Жыхарка Заслаўя Таццяна Васілеўна агучыла прапанову наконт магчымасці прадпрыемстваў, якія валодаюць непрыдатным і старым жыллём, прадаваць яго мясцовым жыхарам, — можа, знойдуцца ахвотныя пашырыць свае плошчы вось такім чынам?!

Спікер верхняй палаты парламента пагадзілася, што пытанні па зямлі і жыллі актуальныя, і даручыла Дзяржкамітэту па маёмасці акцэнтаваць на іх увагу.

Гэтая ж заяўніца агучыла яшчэ адну тэму: уладальнікі жылля сядзібнай забудовы часта вымушаны ацяпляць свае пабудовы з дапамогай печаў (а хацелася б ужо і электрычнасцю), награваць ваду бойлерамі — між тым, карыстанне электрабытавымі прыборамі сёння нятаннае. Ці ёсць магчымасць перагледзець нормы льгот па аплаце электраэнергіі, спытала яна.

Сярод агучаных на прамой лініі прапаноў асаблівую ўвагу выклікае вось гэтая: мінчанка Таісія Іосіфаўна лічыць мэтазгодным адмяніць аплату праезду ў грамадскім транспарце для сталічных жыхароў, якія маюць статус «дзеці вайны», як гэта зроблена ў дачыненні да ветэранаў.

Тэлефанавалі з розных рэгіёнаў краіны, каб проста падзякаваць за тое, што, нягледзячы на ўсе выпрабаванні, кіраўніцтва краіны змагло захаваць мір і стабільнасць. У прыватнасці, пенсіянер з Крычава абураўся паводзінамі сваіх аднагодкаў, якія выходзяць на вуліцы:

— Чаго не хапае?! Пенсіі павышаюцца, усё ёсць! Дзякуй вам, што ў складаную хвіліну вы падтрымалі Прэзідэнта...

Словы ўдзячнасці і падтрымкі таксама выказалі заяўніцы з Бабруйска Любоў Сцяпанаўна і Эма Іванаўна.

Што датычыцца зваротнай сувязі, заўсёды цікавіла, як вырашаюцца праблемныя пытанні, з якімі людзі звяртаюцца на прамую лінію да Наталлі Качанавай.

Як паведамілі ў Савеце Рэспублікі, на адну з апошніх ліній патэлефанаваў жыхар Баранавіч з просьбай пасадзейнічаць у працаўладкаванні. Раней ён звяртаўся да адказных асоб на розных узроўнях, але яго пытанне так і не вырашылася. Пасля прынятых Саветам Рэспублікі мер заяўнік быў працаўладкаваны.

Ці вось яшчэ прыклад. Раней да старшыні Савета Рэспублікі звярнулася маладая барысаўчанка, якая выхоўвае дзіця, з просьбай дапамагчы ёй у атрыманні жылля ў інтэрнаце і, адпаведна, рэгістрацыі там. Разгляду яе звароту аддалі пільную ўвагу ў мясцовым райвыканкаме. Пасля таго як жанчына сабрала неабходныя дакументы і яны былі разгледжаны на пасяджэнні жыллёвай камісіі райвыканкама, у адпаведнасці з заканадаўствам сям'і было выдзелена жылое памяшканне ў інтэрнаце.

Канешне, не ўсе пытанні, з якімі звяртаюцца грамадзяне, можна вырашыць адразу. Некаторыя з іх патрабуюць дэталёвай прапрацоўкі з зацікаўленымі і застаюцца на кантролі ў Савеце Рэспублікі.

Так, напрыклад, на прамую лінію звярнулася сталічная жыхарка з ініцыятывай стварэння ў горадзе скейтадрома і распрацоўкай праекта з дапамогай маладых архітэктараў у выглядзе студэнцкіх дыпломных праектаў. Ідэю накіравалі ў Мінгарвыканкам для разгляду з усімі зацікаўленымі бакамі. Вынікам стала дамоўленасць з БНТУ аб распрацоўцы студэнтамі архітэктурнага факультэта ўніверсітэта праекта скейтпарка ў межах курсавога праектавання вясной 2021 года. Пад такія аб'екты вызначаны пляцоўкі ў парку Перамогі. БНТУ перададзены даныя тапаграфічнай здымкі, а таксама заданне на праектаванне, падрыхтаванае з удзелам грамадскай арганізацыі «Беларуская федэрацыя скейтбордынга». Засталося толькі крыху пачакаць, каб скейтары, нарэшце, атрымалі годнае месца для ўдасканальвання свайго майстэрства.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

У ТЭМУ

### Большасць зваротаў — ад мінчан

**За 9 месяцаў бягучага года членамі Савета Рэспублікі былі разгледжаны 3417 зваротаў, у тым ліку членамі Прэзідыума Савета Рэспублікі — 2446 (68,6 %), праведзены 674 асабістыя прыёмы, на якія звярнуліся 1965 грамадзян, а таксама 276 прамых ліній.**

У верхнюю палату парламента звяртаюцца пераважна пісьмова. Дарэчы, за дзевяць месяцаў 2020 года колькасць зваротаў вырасла ў пяць разоў у параўнанні з такім жа леташнім перыядам.

Як паведамілі ў Савеце Рэспублікі, аўтарамі найбольшай колькасці пісьмовых зваротаў з'яўляюцца жыхары сталіцы — 789 (42,3 %). Другімі ідуць прадстаўнікі Мінскай вобласці — 314 (16,8 %). Самая малая колькасць пісьмовых зваротаў фіксуецца ад жыхароў Гродзеншчыны — 84 (4,5 %).

Па структуры пытанні насілі індывідуальны характар і датычыліся жыллёвага фонду і ЖКГ (20,1 %), землеўладання і землекарыстання (6,7 %), працаўладкавання і занятасці (5,1 %), сацыяльнага і пенсійнага забеспячэння (4,5 %), архітэктуры і будаўніцтва (2,6 %).

РАБОТА Ў РЭГІЁНЕ

# Што хвалюе?

## Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ наведаў Глуск

Магчымасцю трапіць на прыём і выказаць набалелае скарысталіся некалькі жыхароў раёна, што на Магілёўшчыне. Жыхарка вёскі з гучнай назвай Дасціжэнне паскардзілася на пустуючыя ўчасткі, якія, на яе думку, не вельмі хутка ўцягваюцца ў севазварот, недастатковую колькасць ліхтароў па вуліцы Цэнтральнай і разбітыя дарогі. Міхаіл Русы растлумачыў, што сацыяльны стандарт па колькасці ліхтароў у вёсцы вытрымліваецца. Але закон не забараняе грамадзянам рабіць вулічнае асвятленне каля свайго дома за свой кошт. Мясцовыя энергасеткі акажуць пры гэтым усю неабходную тэхнічную дапамогу. Сельвыканкаму даручана больш актыўна задзейнічаць пустуючыя тэрыторыі. А мясцовым уладам — пракантраляваць стан дарогі.

Яшчэ адна жыхарка Глуска паскардзілася, што яе праўнучка, якая зараз вучыцца ў каледжы ў Бабруйску, атрымлівае вельмі маленькую пенсію ў сувязі са стратай кармільца. Заяўніцы расказалі, на якія дзяржаўныя выплаты мае права дзяўчына. Дадатковую работу ў сувязі з гэтай сітуацыяй даручана правесці і райвыканкаму.

Пасля прыёму грамадзян старшыня Пастаяннай камісіі наведаў Глускую цэнтральную раённую бальніцу імя заслужанага ўрача БССР А. Сямёнава, дзе пасля капрамонту адкрыліся дзверы хірургічнага аддзялення на 28 ложкаў і першы пост тэрапеўтычнага аддзялення на 30 ложкаў. Ён адзначыў, што для медыкаў створаны камфортныя ўмовы работы, а для пацыентаў — лячэння. Роўна год таму падчас раённых «Дажынак» Міхаіл Русы, тады яшчэ памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці, удзельнічаў у адкрыцці пасля капрамонту прыёмнага і педыятрычнага аддзяленняў бальніцы. Менавіта тады было абвешчана, што мадэрнізацыя бальніцы працягнецца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ

# 100 прэмій гарсавета

## Днямі старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ у гістарычным будынку ратушы ўручыў прэміі найлепшым школьнікам сталіцы



У размове з карэспандэнтам «МС» ён адзначыў, што гэта ўжо даўняя традыцыя гарсавета — ва ўрачыстай атмасферы ўзнагароджваць навучэнцаў старэйшых класаў, якія маюць дасягненні ў вучобе, мастацтве, спорце, праявілі сябе ў інтэлектуальных і творчых гульнях. Звычайна гэта пераможцы рэспубліканскіх ці міжнародных адукацыйных спаборніцтваў, спартыўных турніраў, гаворыць Андрэй Аляксандравіч.

Сёлета прэміяй адзначаны 68 вучняў, на рахунку якіх дасягненні ў інтэлектуальных спаборніцтвах. 32 прэміі атрымалі юнакі і дзяўчаты за поспехі ў творчасці і выдатныя спартыўныя паказчыкі.

Паводле слоў Андрэя Бугрова, сто прэмій гарсавета — гэта важная падзея ў рабоце з падрастаючым пакаленнем сталіцы. У гарсавеце мяркуюць узмацняць узаемадзеянне з мінскімі школьнікамі, студэнцкай моладдзю. Дэпутаты Мінгарсавета будуць абавязкова і надалей падтрымліваць таленавітых і здольных маладых людзей, тых, хто ў хуткім часе будзе вызначаць інтэлектуальны, прафесійны і творчы шлях як сталіцы, так і ўсёй краіны. Ёсць прапанова пашырыць кола лаўрэатаў прэміі сярод вучняў 9—11 класаў, гэтае пытанне будзе вырашацца на сесіі гарсавета.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# ФІНАНСАВАЕ АЗДАРАЎЛЕННЕ vs ЛІКВІДАЦЫЯ

## «Як зрабіць так, каб паспяховага бізнесу было больш, а прадпрыемстваў-банкрутаў — менш?»

**Парламентарыі разгледзелі навацыі законапраекта аб вызначэнні неплацежаздольнасці (інакш кажучы — аб банкруцтве). Пашыранае пасяджэнне Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах з удзелам дэпутатаў профільнай камісіі Палаты прадстаўнікоў прайшло ў фармаце відэаканферэнцыі ў пятніцу, 6 лістапада. Цэнтральнай тэмай абмеркавання былі навацыі ў законапраекце «Аб вызначэнні неплацежаздольнасці», які зараз рыхтуецца ўрадам да ўнясення ў парламент.**



### Банкруцтва — не прысуд

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** акцэнтавала ўвагу прысутных на тым, што ўдасканаленне інстытута неплацежаздольнасці — адна з найважнейшых тэм для эканамічнага развіцця краіны.

— Ніхто з прадпрыемстваў не застрахаваны ад таго, што па розных абставінах можа стаць неплацежаздольным. Але сама працэдура банкруцтва — не прысуд, а найважнейшы інструмент, які дазваляе ў рэжыме санацыі зрабіць «работу над памылкамі», вярнуць устойлівасць прадпрыемству. А калі гэта немагчыма — размеркаваць фактары вытворчасці ад неэфектыўных уласнікаў і кіраўнікоў да паспяховых менеджараў і ўладальнікаў, — падкрэсліла яна. — Задача дзяржавы заключаецца ў тым, каб вызначыць такія правілы гульні, якія дазволяць забяспечыць максімальны баланс інтарэсаў усіх удзельнікаў: з аднаго боку — суб'ектаў гаспадарання, з другога — дзяржавы і людзей наёмнай працы.

Сенатар упэўнена, «адсекчы» ўсе даўгі і даць магчымасць пачаць гаспадарчую дзейнасць пад кантролем судоў і крэдытораў можна толькі праз працэдуру банкруцтва.

**Намеснік дырэктара дэпартамента па санацыі і банкруцтве Мінэканомікі Рэспублікі Беларусь Станіслаў САДОЎНІКАЎ** нагадаў, што наспеў час прыняцця новага законапраекта: зараз сістэмным дакументам, які рэгулюе адносіны ў сферы банкруцтва, з'яўляецца адпаведны закон, што быў прыняты ў 2012 годзе. Акрамя яго, выкарыстоўваюцца больш за 20 нарматыўных прававых актаў рознага ўзроўню ў гэтай галіне.

Распрацоўка новага законапраекта распачалася яшчэ ў 2015 годзе. Таццяна Рунец нагадала прысутным, што Пастаянная камісія па эканоміцы, бюджэце і фінансах сур'ёзна займаецца гэтай тэмай з самага пачатку работы над новым законапраектам. У пятым скліканні быў праведзены маніторынг практыкі выкарыстання закона «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве». Сумесна з Мінэканомікі папярэднікі правялі не адно мерапрыемства. Гэтую эстафету падхапілі сенатары шостага склікання. Так, падчас круглых сталоў з прыцягненнем міжнародных экспертаў абмяркоўваліся пытанні важнасці і мэтазгоднасці вызначэння кансалідаванага крэдытора ад імя дзяржавы, забеспячэння права работнікаў на заробак пры неплацежаздольнасці наймальнікаў, а таксама падыходы да выбару кандыдатур антыкрызісных кіраўнікоў і іх прызначэнне ў канкрэтныя справы.

> Эканамічны рост у першую чаргу залежыць ад якасці прымаемых у краіне законаў і ад таго, як яны працуюць, — перакананы Станіслаў Садоўнікаў. — Прававыя дакументы могуць быць рухавіком дзелавой актыўнасці, а могуць, наадварот, перашкаджаць яе развіццю. Як зрабіць так, каб паспяховага бізнесу было больш, а прадпрыемстваў-банкрутаў — менш?

У выніку многія прапановы, выпрацаваныя на пляцоўцы Савета Рэспублікі, улічаны ў новай рэдакцыі закона аб банкруцтве, які 30 кастрычніка быў унесены ў Савет Міністраў.

### Неплацежаздольнасць — «тонкая» матэрыя

— Эканамічны рост у першую чаргу залежыць ад якасці прымаемых у краіне законаў і ад таго, як яны працуюць, — перакананы Станіслаў Садоўнікаў. — Прававыя дакументы могуць быць рухавіком дзелавой актыўнасці, а могуць, наадварот, перашкаджаць яе развіццю. Як зрабіць так, каб паспяховага бізнесу было больш, а прадпрыемстваў-банкрутаў — менш? Другая праблема — што рабіць з горадаўтваральнымі прадпрыемствамі, якім неабходна фінансавае аздараўленне? З аднаго боку, законы рынку, без выканання якіх немагчыма здаровая эканоміка. З другога — людзі, жыццёвыя інтарэсы якіх неабходна ўлічваць.

Каб не заблукаць у пошуках адказу на гэтае пытанне, рэгулятарам і быў падрыхтаваны адпаведны законапраект. На думку эксперта, працэдура банкруцтва прадпрыемстваў павінна быць разумна складанай.

**14.40** «Муж напракат» (16+).
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.30 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**17.20** «Супержонка» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.20** «Мяняю жонку» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня». Бульбяная каша з ражанкай.
**8.05, 12.00, 20.20** Навіны культуры.
**8.25** «Гэты дзень».
**8.30 «Тры плюс два». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**10.05** «Люблю і памятаю». Аўтарская праграма Уладзіміра Арлова. Народны артыст СССР Георгій Жжонаў.
**10.45, 16.50 «Шчыт і меч». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.55, 21.05** «Апошні дзень». Людміла Пахомава (12+).
**13.35 «Па вуліцах камоду вадзілі». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**14.50** «Славянскі базар — 2019». Лепшае.
**16.35, 23.45** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**18.10 «Тры плюс два». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**19.55** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.40 «Пакліч мяне ў далеч светлую». Маст. фільм (12+).**
**23.20** «Рэвалюцыя 1917. Эпоха вялікіх перамен». Дак. фільм «Аляксандр Калчак» (16+).

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.10** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Фленсбург» (Германія) — «Мяшкоў-Брэст» (Беларусь).
**8.45** Слэм-данк.
**9.15** Футбол. Ліга нацый УЕФА. Албанія — Беларусь.
**11.15** Між іншым.
**11.35** Футбол. Ліга нацый УЕФА. Польшча — Нідэрланды.
**13.35** Спорт-мікс.
**13.45** Футбол. Ліга нацый УЕФА. Сербія — Расія.
**15.45** Бокс. Міжнародны турнір.
**18.25** Хакей для ўсіх.
**19.00** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — ХК «Сочы». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.30** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Кіль» (Германія) — «Барселона» (Іспанія).
**22.35** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Элверум» (Нарвегія) — «Пік» (Венгрыя). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.40** Нашы навіны.
**9.15** «Аб'ектыўнНА» (16+)
**10.15** «Жыць здорава!» (16+)
**11.15** «Модны прысуд» (6+).
**12.15** «Грамадзянская абарона» (16+).
**13.15, 22.45 Серыял «Страсці па Чапаю» (16+).**
**15.10** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.50** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**21.40 Серыял «Казанова» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 23.55** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 21.45** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.05** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40. 20.50** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.45, 16.50 «Спецы». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Міншчына».
**20.30** «Зроблена».

## МІР

**5.00 Серыял «Двое з пісталетамі» (16+).**
**8.55, 10.10, 18.15, 19.25 Серыял «Забудзь і ўспомні» [СЦ] (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.15** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.15** Сусветнае пагадненне (16+).
**21.40** «Гульня ў кіно».
**22.25** «Назад у будучыню» (12+).
**23.20** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**0.15 Маст. фільм «Алігарх» (12+).**
**2.25 Серыял «Мухтар. Новы след» [СЦ] (16+).**
**3.45** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
**4.10 Серыял «Двое з пісталетамі» (16+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35** «Лёс чалавека» (12+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Марозава» (12+).**
**17.15** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.00 Серыял «Тэарэма Піфагора» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05** Беларусы (6+).
**6.40, 16.20, 19.35, 22.15, 23.40** Сёння. Галоўнае.
**6.50** «Здароўе» (12+).
**7.40, 8.20** «Справа ўрачоў» (16+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.45 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**9.40, 22.20** «НЗ.by».
**10.20, 21.10 Драма «Чужы сярод сваіх» (16+).**
**11.15, 13.45 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**13.20, 16.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.50** Пракурорская праверка (16+).
**16.55, 23.55** «ДНК» (16+).
**18.05, 19.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**22.35 Серыял «Груз» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.50, 21.10, 0.20** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.00** «Мультпарад» (6+).
**7.30, 15.55, 20.50** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Звышнатуральнае» (12+).**
**8.15, 19.20 Серыял «Мар'ін гай» (16+).**
**9.00** М/ф «Балерына».
**10.30** «Гатуй як шэф».
**10.50, 16.20 Серыял «Бярозка» (12+).**
**12.35** Фантастыка «Зорныя войны» (12+).
**15.00 Серыял «Удава» (16+).**
**18.10** «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**18.20 Серыял «Скрозь снег» (16+).**
**19.15** «Надвор'е».
**20.55** «Вечарніца» (6+).
**21.15 Дэтэктыў «Вобраз ворага» (16+).**

## ВТБ

**6.05, 3.15** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.45, 4.35** «Лаві момант» (16+).
**9.10, 14.00** «Наш рамонт» (16+).
**9.50, 14.45** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**10.15** «Супермамачка» (16+).
**11.20, 21.30** Серыял «Сеня-Федзя» (16+).
**12.55** «Руса турыста» (16+).
**16.15** Серыял «Дах свету».
**18.20, 0.05** «Уральскія пельмені» (16+).
**19.25** Серыял «Пагналі» (16+).
**20.30** Серыял «Госці з мінулага» (16+).
**23.00** Серыял «Каманда Б» (16+).
**1.05** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**2.20** «Адна за ўсіх» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква барочная.
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35, 18.35** «Акіяны Сонечнай сістэмы». Дак. фільм [СЦ].
**8.25** Легенды сусветнага кіно. Тацццяна Самойлава.
**8.55, 16.30** «Дзікае паляванне караля Стаха». Маст. фільм. 1-я серыя [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.55** XX стагоддзе. «Любімая роля. Суаўтары». Дак. фільм.
**12.15** Прыгожая планета. «Італія. Саборная плошча ў Пізе».
**12.30, 22.10** «Чалавек у прахадным двары». Маст. фільм [СЦ].
**13.35** Колер часу. Надзя Рушава.
**13.50** Абсалютны слых.
**14.30, 23.15** «Восем смяротных грахоў». Дак. серыял [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. Тэатр.
**15.20** Пернікавы домік. «Рускі драўляны церам» [СЦ].
**15.45** «2 Вернік 2».
**17.40, 2.00** Люцэрнскі фестываль. Андрыс Нелсанс і Люцэрнскі фестывальны аркестр.
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Адкрытая кніга. Аляксандр Архангельскі. «Бюро праверкі» [СЦ].
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** Кіно пра кіно. «Таямніца двух акіянаў». Іду на апусканне!» Дак. фільм [СЦ].
**21.25** «Энігма». Кэмеран Карпентэр.
**0.05** «Вулканы Сонечнай сістэмы». Дак. фільм [СЦ].

## Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Буран. Перапынены палёт». 2006 год (16+).
**6.55, 8.40, 9.45, 11.00, 14.35, 15.45, 17.00, 18.40, 20.40, 21.45, 23.00, 0.55, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.20** «Пад знакам задыяка. Скарпіён». 1992 год (18+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год (12+).
**13.15** Маст. фільм «Вернасць» (16+).
**18.00** «Яловая субмарына». 2005 год (16+).
**19.10** Маст. фільм «Каротка сустрэчы» (16+).
**23.20** Дак. фільм «Фільм пра фільм. Гараж, ці Ноч у музеі». 2011 год (16+).
**0.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год (18+).
**1.05** Маст. фільм «Дыялог з працягам» (16+).
**2.25** «Ранішняя пошта». 1985 год (12+).

## EuroSport 1

**2.05, 6.00, 12.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету — 2019/20 (12+).
**3.30, 7.00, 10.30, 15.00, 21.45** Снукер. Northern Ireland Open (6+).
**5.00** Аўтагонкі. World Endurance. Агляд (12+).
**9.00** Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
**13.30** Аўтагонкі. WTCR (12+).
**21.10** Гольф (6+).

## Кінакамедыя

**1.30** Замуж на два дні (12+).
**4.05** Украдзі маю жонку (16+).
**5.55** Нягледзячы ні на што (16+).
**8.05** Эддзі (12+).
**10.00** Каханне і іншыя лекі (16+).
**12.10** Прасунуты (16+).
**13.50** Кучаравы Сью (12+).
**15.50** Ніндзя з Беверлі Хілз (12+).
**17.30** Падмена (16+).
**19.30** Любоў да сабак абавязковая (16+).
**21.25** 100 мільёнаў еўра (16+).
**23.15** Ну што, прыехалі? (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.30, 23.35** «Улегцы» (12+).
**9.05, 15.25, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**10.10, 17.10** «Старац» (16+).



**10.50, 18.20, 3.05** «Сляпая» (16+).
**12.00, 19.30** «Варажбітка» (12+).
**13.10** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.15** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.30, 4.00** «Знакі лёсу» (16+).
**20.45** «Косці». Серыял (16+).
**22.35** «Грым». Серыял (16+).
**0.15** «Знак якасці» (16+).
**1.05** «Хуткасць-2». Маст. фільм (12+).

## ТБ1000

**6.40** Быць Астрыд Ліндгрэн (16+).
**9.05** Чужы білет (12+).
**10.55** Добра быць ціхоняй (16+).
**12.50** Парк Юрскага перыяду (16+).
**15.05** Парк Юрскага перыяду-2: закінуты свет (16+).
**17.20** Парк Юрскага перыяду-3 (16+).
**19.00, 5.15** Як пазбавіцца ад хлопца за 10 дзён (12+).
**21.05** Вясельны перапалох (12+).
**23.00** Дзяўчына з Джэрсі (16+).
**0.45** Талі (18+).
**2.20** Паўночнае сонца (16+).
**3.40** Двайное жыццё Чарлі Сан-Клаўда (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**7.50** Джэнтльмены, удачы! (12+)
**9.40** Вечнае жыццё Аляксандра Хрыстафорава (16+).
**11.35** Іронія лёсу. Працяг (12+).
**13.35, 19.00** Чорныя кошкі (16+).
**15.15** Мне не балюча (16+).
**17.10** Золушка (16+).
**20.45** Дублёр (16+).
**22.20** Скарбы В.К. (16+).
**0.10** Калякфутбола (18+).
**2.05** Суперменеджар, ці Матыка лёсу (16+).
**3.35** Код апакаліпсісу (16+).
**5.30** Эхалі два шафёры (12+).

## National Geographic

**6.00, 15.50, 20.05, 5.45** Фабрыка ежы (16+).
**6.15** Навуковыя глупствы (16+).
**6.40, 13.20, 17.35, 5.00** Аўта-SOS (16+).
**7.25, 10.45** Інстынкт выжывання (16+).
**8.15** Ледзяная дарога (16+).
**9.05, 16.40** Дзікі тунец (16+).
**11.35** Зона будаўніцтва (16+).
**12.25, 16.40** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**14.10, 18.25, 21.00, 2.40** Расследаванне авіякатастроф (16+).
**15.00, 19.15** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**21.50** Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія і Перу (16+).
**22.40** Гарачыя межы: Лацінская Амерыка (16+).
**23.30** Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
**1.55** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**3.25** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**4.10** Асушыць акіян (16+).

## Discovery

**8.00** Залатыя шлях Паркера Шнабеля (16+).
**8.45, 18.03** Багажныя войны (12+).
**9.35, 17.12, 19.45** Махінатары (12+).
**10.25, 20.36, 5.42** Паляўнічыя на склады (16+).
**11.15, 15.30, 21.27, 4.56** Як гэта ўладкавана? (16+).
**12.06** Геній аўтадызайну (12+).
**12.57** Рэстаўратары лодак (12+).
**13.48** Дабітыя тачкі (12+).
**16.21** Музейныя загадкі (12+).
**18.54** Рэальныя дальнабойшчыкі (12+).
**22.18** Круты цюнінг (12+).
**23.09** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**0.00** Залатая ліхаманка (16+).
**1.42** Выжыць разам (12+).
**2.33** Палёты ўглыб Аляскі (12+).
**3.24** Выбуховае шоу (16+).
**4.10** Браты Дызель (12+).
**6.28** Голыя і напалоханыя XL (16+).
**7.14** Голыя і напалоханыя (16+).


Фота Марыны ВАСІЛЬЕВАЙ.

# КАНСТРУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ

**У Гомелі прайшоў рэгіянальны форум «Канстытуцыйная рэформа як значны фактар эканамічных, палітычных і сацыяльных пераўтварэнняў». Гэта вынік усіх дыялогавых пляцовак па прапановах для абмеркавання на Усебеларускім народным сходзе.**

Маштабная дыскусійная пляцоўка сабрала ў Гомелі прадстаўнікоў улады, палітычных партый, маладзёжнага парламента і дэпутатаў усіх узроўняў. Удзел у выніковым рэгіянальным форуме таксама бралі рэктары ВНУ Гомельшчыны, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый.

Актуальныя прапановы, агучаныя і падтрыманыя падчас ранейшых дыскусій, назвала **дэкан юрыдычнага факультэта ГДУ імя Ф. Скарыны Ірына ЭСМАНТОВІЧ.** Гэта замацаванне ў Асноўным Законе прыярытэтаў знешняй палітыкі, умацаванне брацкіх адносін у Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі, падтрыманне традыцыйных каштоўнасцяў беларускага народа і асноў беларускай дзяржавы.

Эксперты падтрымалі таксама меркаванне аб пераразмеркаванні канстытуцыйных паўнамоцтваў Прэзідэнта, парламента, урада з узмацненнем ролі парламента. Удзельнікі падкрэслівалі і важнасць павелічэння тэрміна паўнамоцтваў Нацыянальнага сходу і мясцовых Саветаў дэпутатаў да пяці гадоў. Гэта дазволіла б у тым ліку ўкараніць адзіны дзень галасавання па іх адначасовым абранні.

Яшчэ адна прапанова ад экспертаў рэгіёна — пераход на змешаную выбарчую сістэму пры выбарах у Палату прадстаўнікоў для ўзмацнення ролі палітычных партый у грамадскім жыцці краіны.

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Сяргей СЦЕЛЬМАШОК** выказаўся за павышэнне ролі мясцовага кіравання і самакіравання. На яго думку, у мясцовыя Саветы варта перадаць больш магчымасцяў распараджацца бюджэтам, у тым ліку датацыямі.

**Старшыня Акцябрскага раённага Савета дэпутатаў Алег ТАРГОНСКІ** звярнуў увагу, што ўдзельнікі дыскусій лічаць важным аптымізаваць дзейнасць Саветаў дэпутатаў і выканкамаў пярвічнага ўзроўню, скасаваўшы Саветы з пераразмеркаваннем іх функцый.

— Прапануецца, напрыклад, пытанні адміністрацыйных працэдур, кіравання і распараджэння дзяржмаёмасцю, пытанні ў сферы бюджэтнага і падатковага заканадаўства замацаваць за адпаведнымі выканкамамі пярвічнага ўзроўню альбо за ізноў створанымі тэрытарыяльнымі адміністрацыямі. Усе астатнія пытанні, у тым ліку добраўпарадкавання, замацаваць за органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, — адзначыў старшыня райсавета.

Была таксама выказана ідэя ад вобласці — праводзіць штогадовыя форумы развіцця рэгіёнаў з магчымасцю атрымання на конкурснай аснове грантаў з мясцовых бюджэтаў.

**Дырэктар сярэдняй школы № 11 Гомеля, намеснік старшыні Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў Наталля ЛІТВІНАВА** агучыла ідэі па ўдасканаленні нацыянальнай сістэмы адукацыі:

— Лічым неабходным унесці ў Кодэкс аб адукацыі нормы, якія рэгламентуюць магчымасць навучання ў дыстанцыйнай форме. Прапануем распрацаваць нарматыўна-прававы дакумент, які вызначыць парадак арганізацыі дыстанцыйнага навучання, стварыць адзіную нацыянальную сістэму электроннай адукацыі, — прапанавала Наталля Літвінава.

Яшчэ адна тэма, якая абмяркоўвалася на дыскусійных пляцоўках у рэгіёне, — аб'яднанне выпускной і ўступнай кампаній праз адзіную незалежную атэстацыю. У якасці варыянта быў прапанаваны так званы адзіны экзамен.

— Толькі ў канструктыўным дыялогу, а не на вуліцах і плошчах, можна ўвасабляць у жыццё рэальныя змены да лепшага. Менавіта ад нашага ўдзелу, усведамлення адказнасці за прынятыя рашэнні залежыць тое, які курс далейшага развіцця прыме рэгіён і краіна, — абагульніў асноўную мэту падобных дыялогавых пляцовак **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.**

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

У тэму

## БОЛЬШ ЗА 60 ПРАПАНОЎ

Вынікі работы дыялогавых пляцовак падвялі ў Гродне

**На пасяджэнні абласнога арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні шостага Усебеларускага народнага сходу былі падведзены вынікі работы дыялогавых пляцовак. Мерапрыемства адбылося ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы.**


www.grodnonews.by

Трэба сказаць, што з сярэдзіны кастрычніка ў абласным цэнтры былі праведзены дзевяць дыялогавых пляцовак, па некаторых тэмах такое абмеркаванне прапанавана зрабіць па пастаяннай аснове.

Як паведаміў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ,** які прымаў удзел у пасяджэнні аргкамітэта, у выніку 62 прапановы будуць накіраваны для далейшага разгляду, да таго ж значная частка з іх (25) сфарміраваны менавіта моладдзю.

Нагадаем, што прапановы з усіх рэгіёнаў, у тым ліку і Гродзеншчыны, абмяркуюць на шостым Усебеларускім народным сходзе. Пасля гэтага частка з іх будзе ўключана ў выніковы дакумент — праект новай Канстытуцыі нашай краіны.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

ВОПЫТ ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ

# ДАПАМОЖНІК ДЛЯ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ

Дэпутаты Магілёўскай вобласці падагульнілі вопыт работы органаў мясцовага самакіравання

**Шмат актыўных людзей імкнецца зрабіць свае населеныя пункты больш цікавымі і прывабнымі. Адны талакой добраўпарадкуюць зоны адпачынку, другія ствараюць дзіцячыя пляцоўкі, трэція ўладкоўваюць мясціны памяці. І гэты вопыт бясцэнны, бо народныя праекты ідуць ад душы і амаль не фінансуюцца. Магілёўская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў разам з аблсаветам дэпутатаў правялі семінар і падагульнілі гэты вопыт. Мэта — дасканала вывучыць яго і распаўсюдзіць.**

## Семукачы як генератар ідэй

Пра шматлікія праекты **старшыні Семукацкага сельсавета Тамары УКРУЖСКАЙ** і яе каманды мы пісалі неаднаразова. Акцэнт робіцца на патрыятычным выхаванні моладзі і захаванні традыцый раёна. Тут добра арганізавана работа па аказанні дапамогі маламаёмным, адзінокім і сацыяльна неабароненым грамадзянам, ветэранам вайны і працы. Ініцыятывы ад насельніцтва ахвотна падтрымліваюцца і рэалізуюцца.

— Самым распаўсюджаным відам дзейнасці па навядзенні парадку на аддаленых і маленькіх населеных пунктах з'яўляецца правядзенне суботнікаў, — лічыць Тамара Укружская. — Жаданне навесці парадак павінна зыходзіць ад жыхароў. І ў гэтым выпадку вялікая роля адводзіцца старастам. Яны выступаюць сувязным звяном паміж грамадзянамі і сельвыканкамам, праводзяць сельскія сходы, інфармуюць жыхароў аб рабоце Савета і рашэннях, прынятых на пасяджэннях выканкама. Сёлета ў нас адбыліся 25 сельскіх сходаў.

У сваёй прэзентацыі дэпутат наглядна паказала, як рукамі ініцыятыўных жыхароў добраўпарадкуюцца калодзежы, мемарыяльныя мясціны, ствараюцца сцежкі здароўя. З мінулага года па ініцыятыве насельніцтва рэалізуецца праект «Вяртанне да вытокаў», у рамках якога аднаўлена крыніца ў вёсцы Паўлаўск і працягваюцца работы па аднаўленні водных аб'ектаў у вёсцы Алень і аграгарадку Семукачы. Па ініцыятыве самой старшыні Тамары Укружскай у аграгарадку Семукачы створаны этнаграфічны пакой у выглядзе беларускай хаткі. Апагеем народнай самадзейнасці стала стварэнне да 75-годдзя са дня Вялікай Перамогі алеі памяці ў гонар удзельнікаў войнаў XX стагоддзя.

## Найлепшыя па садзейнічанні ў самазанятасці

Летась Краснапольскі раён стаў адным з найлепшых партнёраў праекта «Сеткавае ўзаемадзеянне для паляпшэння магчымасцяў занятасці і самазанятасці насельніцтва ў сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці». Ён рэалізуецца Слаўгарадскім райвыканкамам у партнёрстве з Быхаўскім, Клічаўскім, Краснапольскім і Чэрыкаўскім райвыканкамамі і Міжнародным фондам развіцця сельскіх тэрыторый пры фінансавай падтрымцы Еўрасаюза. У рамках праекта на тэрыторыі Горскага сельсавета рэалізавана мясцовая ініцыятыва «Расток». На базе дапаможных гаспадарак грамадзян былі арганізаваны дзве пляцоўкі, дзе 15 жыхароў аграгарадка атрымалі веды па вырошчванні па новых тэхналогіях расады агароднінных і кветкавых культур. У выніку шэсць сем'яў былі ўцягнуты ў самазанятасць і палепшылі якасць свайго жыцця. Падчас рэалізацыі яшчэ адной «аграрнай» ідэі на базе Палужскага дзіцячага садка-сярэдняй школы была створана эксперыментальная цяпліца па вырошчванні клубнічнай расады. Некалькі чалавек далучыліся да дзейнасці і атрымалі і сваё карыстанне бясплатную расаду. Акрамя таго, на базе школы створаны бізнес-клас, дзе можна будзе на працягу года навучаць гэтай справе да 50 чалавек. І гэта толькі некалькі праектаў з тых, якія былі рэалізаваны на тэрыторыі раёна.

— З мэтай стварэння ўмоў для дзяржаўна-прыватнага дыялогу, супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння, а таксама павышэння значнасці грамадскіх ініцыятыў у раёне працуюць шэсць ініцыятыўных груп, — адзначыла **старшыня Краснапольскага райсавета Анжаліка ГОМАН.** — Іх дзейнасць каардынуе наш раённы Савет дэпутатаў. У справе таксама ўдзельнічае некамерцыйная арганізацыя «Мясцовы фонд развіцця тэрыторый «Старт-Усход».

Асноўнай пляцоўкай рэалізацыі мясцовых ініцыятыў і развіцця праектнай дзейнасці з'яўляецца тэрыторыі сельсаветаў раёна. Там створаны рэсурсныя цэнтры для збору неабходнай інфармацыі, планавання і абагульнення наяўнага вопыту работы.


Мясцовыя патрыёты сваімі рукамі зрабілі ў Семукачах алею ў гонар удзельнікаў усіх войнаў XX стагоддзя.

## Дапамога для актыўных

Пра мясцовую форму супрацоўніцтва дэпутатаў з актывістамі расказаў **старшыня Асіповіцкага райсавета Сяргей СУВЕЯЎ.** З мэтай каардынацыі дзейнасці камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ў раёне створаны савет органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання з дзесяці чалавек і зацверджана палажэнне аб ім. На яго падставе найбольш актыўныя члены органаў самакіравання штоквартальна заахвочваюцца ў памеры адной базавай велічыні. Летась былі адзначаны 183 чалавекі — яны атрымалі дапамогу на агульную суму 4,7 тысячы рублёў. Сёлета на заахвочванне 90 чалавек выдаткавана ўжо 2,5 тысячы рублёў.

— Стымуляванне органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання дазваляе актывізаваць работу і ўзмацніць ролю нашых памочнікаў як пярвічнага сувязнога звяна структур улады з насельніцтвам, — падкрэсліў старшыня райсавета. — Такія людзі, як Наталля Барадаўка, Наталля Мельнік, Лілія Лабус, Ігар Гапа, на практыцы пацвярджаюць прынцып «Стараста — гэта не званне і не пасада. Гэта спосаб жыцця».

— Клімавіцкі, Асіповіцкі, Краснапольскі і Магілёўскі раёны вельмі паказальныя ў плане работы з ініцыятывамі грамадзян, — адзначыла **намеснік старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК.** — Мы вырашылі зрабіць аналіз іх дзейнасці і паказаць іншым раёнам, якім чынам можа быць пастаўлена работа па грамадскім самакіраванні.

— Трэба аб'яднаць патэнцыял і магчымасці партнёраў адпаведнай тэрыторыі для самастойнага вырашэння пытанняў мясцовага значэння, развіцця ініцыятывы і арганізацыі дыялогу з насельніцтвам, — падкрэсліла **выканаўчы дырэктар Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Паліна ЦЕРАШКОВА.** — Уцягванне камітэтаў тэрытарыяльных органаў самакіравання ў рашэнне агульнагарадскіх, раённых задач непазбежна прывядзе да ўмацавання інстытута мясцовага самакіравання.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з архіва асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.**

ДЫЯЛОГ

# Жыхары Даўгінава агучылі праблемы, іх пачулі

**СТАРШЫНЯ Вілейскага раённага Савета дэпутатаў Алена ЧАБАТАР сустрэлася з актывам Даўгінаўскага сельсавета, дзе прайшло сумеснае абмеркаванне пытанняў далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна, добраўпарадкавання і ўладкавання населеных пунктаў. Менавіта ў аграгарадку Даўгінава ў наступным годзе адбудзецца раённае свята работнікаў сяла «Дажынкі».**

— Сёлета «Дажынкі» праходзілі ў аграгарадку Лыцавічы Іжскага сельсавета, падчас якіх старшыня сельгаспрадпрыемства «Чурлёны», што размешчана на тэрыторыі гэтага сельсавета, перадаў эстафету правядзення фестывалю дырэктару ААТ «Даўгінава», — гаворыць Алена Аляксандраўна.

Акрамя таго, старшыня сельвыканкама пацікавілася ў жыхароў, што б яны хацелі добраўпарадкаваць у першую чаргу і якая дапамога ім патрэбна. Высветлілася, што неабходны ямачны рамонт вуліцы Пралетарскай і асфальтаванне пляцоўкі, дзе некалі стаяў магазін, для арганізацыі выязнога гандлю. Алена Аляксандраўна паабяцала, што просьба будзе адрасавана дарожным службам. Падымалі грамадзяне і пытанне ачысткі пажарных вадаёмаў. Алена Чабатар запэўніла, што сельвыканкам сумесна з раённым аддзелам па надзвычайных сітуацыях вырашыць гэтую праблему.

Жыхары таксама прасілі, каб у аграгарадку ўстанавілі дадатковыя кантэйнеры для цвёрдых бытавых адходаў. Алена Аляксандраўна паведаміла ім, што Вілейская ЖКГ закупляе партыю кантэйнераў і частку іх уладкуе ў Даўгінаве.

У канцы сустрэчы адбылася своеасаблівая дыялогавая пляцоўка, дзе кожны ўдзельнік змог выказаць свае прапановы па ўнясенні змяненняў у Асноўны закон краіны. У сваю чаргу Алена Чабатар агучыла перад прысутнымі прапановы жыхароў Вілейкі, якія ўжо накіраваны ў Палату прадстаўнікоў для далейшага разгляду.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Будзем з бульбай!

## У Гомельскай вобласці фарміруецца стабілізацыйны фонд плодаагароднінная прадукцыі

**ЯГО мэта — захаванне стабільнай сітуацыі на спажывецкім рынку і прадухіленне рэзкага павелічэння кошту на гэты від харчовых тавараў у міжсезонны перыяд.**

У адпаведнасці з рашэннем Гомельскага аблвыканкама, сёлета ў стабілізацыйныя фонды закладваецца восем тысяч тон бульбы, больш за чатыры тысячы тон капусты, каля дзвюх тон морквы, 1,4 тысячы тон буракоў, 3,5 тысячы тон цыбулі і 1,75 тысячы тон яблыкаў.

Аб'ёмы закладкі вызначаны з улікам попыту на ўнутраным рынку на свежую плодаагародніннуюпрадукцыю ў міжсезонны перыяд. Улічваюцца і наяўныя ўмовы для забеспячэння яе захаванасці. Стабілізацыйныя фонды сфарміраваны пераважна сельгасвытворцамі і арганізацыямі гандлю, якія заключылі дамовы на пастаўку прадукцыі з сельгасарганізацыямі і фермерскімі гаспадаркамі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

МАЛАЯ РАДЗІМА

# У ВЁСКУ ВУГАЛЕЦ — ПА СВЕЖАЕ ПАВЕТРА,

## або Чаму сюды пераязджаюць многія гараджане



**ВЁСКА Вугалец, што на тэрыторыі Турынскага сельсавета Пухавіцкага раёна, адрозніваецца ад многіх населеных пунктаў не толькі Мінскай вобласці, але і краіны. Шмат якія з іх вымiраюць. А Вугалец, можна сказаць, з кожным годам квітнее ўсё больш. Тут няма ніводнага старога або пустуючага дома, а летам вёска напаўняецца дзіцячымі галасамі.**

Раней населены пункт уваходзіў у аўкцыённую зону. Цяпер жа зямельныя ўчасткі купляюць у прыватных асоб. У вёсцы налічваецца 125 домаўладанняў, але пастаянна пражываюць у 29. У астатніх — вясной і летам, калі сюды прыязджаюць дачнікі або тыя, хто захаваў сваё радавое гняздо. Гэты куток запатрабаваны, паколькі знаходзіцца ў маляўнічых мясцінах, на беразе Волмы — адной з найбольш чыстых рэк Беларусі. З усіх бакоў яго атачае грыбны сасновы бор.

> Ёсць тыя, хто рэдка прыязджае, дрэнна даглядае сваё радавое гняздо. Але такога, каб хтосьці адмаўляўся ад бацькоўскай спадчыны, няма.

— Летась мы распрацавалі тут план забудовы жылога масіву, — распавяла **старшыня Турынскага сельскага Савета Святлана ХАРЫТОНЧЫК.** — Усяго нарэзалі 16 зямельных участкаў. На сённяшні дзень з іх засталося толькі тры. Набылі іх у прыватную ўласнасць пераважна мінчане. Сярод пакупнікоў — толькі некалькі жыхароў Мар'інай Горкі. У далейшым тут узнікне прыгожы завулак Ціхі. Знаходзіцца ён будзе ў маляўнічым кутку на ўскрайку лесу. Плошча часткова зарасла маладымі соснамі. Іх хацелі высекчы, але будучыя жыхары папрасілі пакінуць гэтую прыгажосць на ўчастку.

— Людзі, якія прыязджаюць у сельсавет, каб набыць дом або ўчастак, выказваюць пажаданне, каб яны былі бліжэй да лесу, рэчкі, у экалагічна чыстым месцы, — працягвае Святлана Станіславаўна. — А ўсяго ў нас налічваецца 29 населеных пунктаў. Але яны не так запатрабаваны, як Вугалец. На сённяшні дзень у пераліку пустуючых або старых на тэрыторыі сельсавета 23 дамы. Гэта, лічу, няшмат. Па дзевяці з іх мы шукаем гаспадароў або спадчыннікаў. З гаспадарамі 13 дамоў працуем па пытаннях уладкавання такой маёмасці, выдаём ім паведамленні, прадпісанні, каб навялі парадак. Ёсць тыя, хто рэдка прыязджае, дрэнна даглядае сваё радавое гняздо. Але такога, каб хтосьці адмаўляўся ад бацькоўскай спадчыны, няма. За мінулы год мы знайшлі ў Мінску ўнукаў, якім бабуля пакінула завяшчанне, дапамаглі ім уступіць у спадчыну. І яны засталіся задаволеныя, прыязджаюць і карыстаюцца домам.

...Да вёскі Вугалец вядзе добрая дарога — ні калдобін, ні ўхабін. Відаць, камунальнікі яе даглядаюць. Яшчэ пры Савецкім Саюзе тут, у сасновым лесе, планавалі пабудаваць санаторый. Задума так і не ажыццявілася, а вось дарогу праклалі. Не асфальтавую, але даволі шырокую і зручную.

— Тут жыве былы вайсковец, які пераехаў з Мар'інай Горкі, Андрэй Кітаў, — праводзіць для мяне экскурсію Святлана Харытончык. — Ён адбудаваў сваімі рукамі дом, уладкаваў лазню, вадаём.

Прывольна адчувае сябе ў сваім двары і вялізны алабай Малік. Вельмі разумны сабака, зусім не агрэсіўны да добрых людзей. Прыняў ён за сябра і маленькую бадзяжную самку Ірыску, якую прынялі гаспадары. Святлана Станіславаўна расказала, што аднойчы ледзьве не заблукала ў лесе. Выйшла на дарогу дзякуючы таму, што пачула брэх Маліка.

Сёння ўжо цяжка ўявіць вёску без Андрэя Мікалаевіча. Да яго заўсёды можна звярнуцца па дапамогу і ён ніколі не адмовіць, як і яго жонка. Гэта вельмі прыстойная сям'я, сцвярджае мая суразмоўніца.

У Марыі Церашковіч на акуратным падворку зззяюць рознымі колерамі хрызантэмы. А як жа інакш? Марыя Мікалаеўна — старэйшына вёскі і папавінна паказваць прыклад іншым. Яна жыве тут каля 60 гадоў, з таго часу як выйшла сюды замуж. Працавала паляводам, даяркай, загадчыцай фермы.

— Вугальчане заўсёды былі вельмі шчырыя, адкрытыя людзі, гатовыя дапамагчы адно аднаму ў складаных сітуацыях. Сёння, праўда, я многіх не ведаю, бо шмат хто з гараджан пабудаваў або купіў тут дамы, — кажа яна. — А са сваімі равеснікамі больш размаўляю па тэлефоне, бо для сустрэч не тыя ўжо сілы і здароўе.

Яны таксама тэлефануюць ёй па пільнай патрэбе.

— У Марыі Мікалаеўны ёсць спіс усіх экстранных нумароў і адрасоў раённых службаў і падраздзяленняў, — канстатуе Святлана Харытончык. — Яна падтрымлівае пастаянную сувязь са мной і перадае просьбы і пажаданні сваіх землякоў. Скаргаў, як правіла, з іх боку не бывае. Гэтыя самастойныя і працавітыя людзі, якія прывыклі вырашаць свае праблемы. І з такімі жыхарамі Вугалец, упэўнена яна, будзе жыць і развівацца.

> Людзі, якія прыязджаюць у сельсавет, каб набыць дом або ўчастак, выказваюць пажаданне, каб яны былі бліжэй да лесу, рэчкі, у экалагічна чыстым месцы.

— Калі раней тут была адна вуліца, то цяпер чатыры. У перспектыве з'явіцца і завулак Ціхі, — радуецца старшыня сельвыканкама.

Магчыма, і моладзь пераязджала б сюды на пастаяннае месца жыхарства. Але ў вёсках цяжкавата з рабочымі месцамі. Дакладней, з прэстыжнымі. Маладыя людзі не надта ахвотна ідуць у жывёлаводы ці паляводы. А пакуль яны едуць сюды на адпачынак, па свежае паветра і маляўнічую прыроду, што таксама радуе.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 12 лістапада 2020 года.**

ГОМЕЛЬШЧЫНА: ЗЯМЛІ НАДЗЕЙНАЯ АПОРА

Спецвыпуск да Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці

# ВАЖКІ КАРАВАЙ

## Аграрыі Гомельшчыны сёлета на трэць павялічылі намалот

**У бягучым годзе аграрыі рэгіёна з найлепшымі вынікамі па збожжы падыходзяць да завяршэння года. Працаўнікамі вёскі намалочана 915 тысяч тон збожжавых, зернебабовых і крупяных культур, што складае 132 % да ўзроўню мінулага года.**



Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ падчас віншавання працаўнікоў вёскі.

### ЛІДАРЫ ВЫТВОРЧАСЦІ

Калі ацэньваць уклад у каравай кожнага раёна, то самыя істотныя долі ў Буда-Кашалёўскім — 94,2 тысячы тон збожжа, Рэчыцкім — 86,3 тысячы тон, Рагачоўскім — 86,3 тысячы тон.

Па ўраджайнасці тройку лідараў узначальвае Рэчыцкі раён — 33 ц/га, на другім месцы — Чачэрскі 32,2 ц/га, на трэцім — Буда-Кашалёўскі — 31,4 ц/га. Усяго ж 10 раёнаў паказалі тэмп росту валавога збору вышэйшы за сярэднеабласны.



Галоўны аграном філіяла «Аграфірма імя Лебедзева» РУП «Гомельэнерга» Алеся КРЫВІЦКАЯ.

Падводзячы вынікі жніва-2020, трэба адзначыць, што першым у вобласці завяршыў уборку збожжавых і выканаў дзяржзаказ Добрушскі раён. Самая высокая ўраджайнасць сярод гаспадарак — 53 ц/га — паказала ААТ «Отар» Чачэрскага раёна. Па 49 ц/га — паказчыкі «Антонаўка-Агра» Жлобінскага раёна і аграфірмы імя Лебедзева ў Веткаўскім раёне. У КСУП «Саўгаса-камбіната «Зара», «Тураўшчыны» і філіяла Рэчыцкай «Савецкай Беларусі» — па 47 ц/га.

### НАЙЛЕПШЫЯ НА ЖНІВЕ

Колькасць тысячнікаў за гэтую ўборачную ў параўнанні з мінулай кампаніяй павялічылася ў тры разы і склала 375 экіпажаў.

Усяго ў вобласці кожны трэці экіпаж з пачэсным званнем тысячнікаў. Па колькасці такіх экіпажаў лідзіруюць Буда-Кашалёўскі, Рагачоўскі і Рэчыцкі раёны.

Тысячу і больш тон збожжа з палёў перавезлі 303 кіроўцы. Пры гэтым кожны восьмы — з маладой змены.

На рахунку 55 чалавек — па дзве тысячы тон, яшчэ ў шасці — па тры. Самы высокі вынік — без малога 4 тысячы тон.

У гэтым годзе 75 маладзёжных экіпажаў сабралі запаветную тысячу тон збожжа. Гэта ў тры разы больш, чым летась.

Яшчэ адной асаблівасцю ўборачнай кампаніі — 2020 стала работа 11 жанчын у складзе экіпажаў-тысячнікаў, працавала больш за 100 сямейных экіпажаў-рэкардсменаў.

### НОВАЯ ТЭХНІКА

Асаблівую ўвагу ў рэгіёне надаюць абнаўленню тэхнічнага парку. З улікам мінулага года ў гэтую ўборачную кампанію на палях рэгіёна працавала 2260 адзінак новай тэхнікі, у тым ліку — 28 газаматорных камбайнаў экалагічнага класа, якія добра зарэкамендавалі сябе ва ўборцы збожжавых і кукурузы. Сярод відавочных пераваг новай айчыннай тэхнікі — выдаткі на газ амаль у 2,5 раза меншыя, чым на дызельнае паліва.

Аграсэрвісы вобласці сёлета вярнулі ў працоўны строй больш за 200 адзінак тэхнікі, сярод іх 16 камбайнаў і 50 энерганасычаных трактароў.

### ПА ПРАЦЫ — УЗНАГАРОДЫ

На галоўным свяце аграрыяў Гомельшчыны «Дажынкі-2020», якое прайшло ў Мазыры, падзякі Прэзідэнта Беларусі атрымалі дырэктар УП «Палессе-Аграінвест» Петрыкаўскага раёна Міхаіл Капінскі і механізатар агракамбіната «Холмеч» Рэчыцкага раёна Іван Вырвіч. Ганаровымі граматамі Адміністрацыі Прэзідэнта ўзнагароджаны дырэктар КСУП «Саўгас-камбінат «Зара» Мазырскага раёна Алег Слінько і трактарыст-машыніст агракамбіната «Холмеч» Васіль Коваль.

Першае месца сярод раёнаў па вытворчасці збожжа — у Жлобінскага. Тут тэмп росту валавога збору збожжа да сярэдняга ўзроўню папярэдніх трох гадоў склаў 130 %. Сярод сельскагаспадарчых арганізацый пераможцам названа эксперыментальная база «Крынічная» Мазырскага раёна. Пальма першынства сярод камбайнераў збожжаўборачных камбайнаў — у Івана Вырвіча з агракамбіната «Холмеч» Рэчыцкага раёна. Найлепшым маладзёжным экіпажам названы тандэм Дзмітрыя Ляшчынскага і Рамана Даніліка з «Савецкай Беларусі» Рэчыцкага раёна. Першае месца сярод кіроўцаў, якія перавозілі зерне ад камбайнаў, прысудзілі Рыгору Малочку з ААТ «Чамярыскі» Брагінскага раёна. Дыпломы першай ступені сярод галоўных аграномаў уручылі Мікалаю Быкоўскі з СВК «50 гадоў Кастрычніка» Рэчыцкага раёна і Алесі Крывіцкай, якая прадстаўляе аграфірму імя Лебедзева РУП «Гомельэнерга» Веткаўскага раёна.

### КУКУРУЗА І БУЛЬБА

Трэба адзначыць, што істотны ўклад у вытворчасць збожжа ў вобласці належыць кукурузе — каля 250 тысяч тон. Сярод лідараў па хуткасці і ўраджайнасці ў гэтым кірунку — Светлагорскі і Мазырскі раёны.

Цяпер убрана кукурузы на зерне звыш 20 тысяч гектараў, намалочана каля 103 тысяч тон збожжа з сярэдняй ураджайнасцю 50 ц/га. На кармавыя мэты ўбрана кукурузы амаль 245 тысяч гектараў, нарыхтавана больш за 3,7 мільёна тон зялёнай масы. Што датычыцца ўборкі агародніны і бульбы, то накапана каля 80 тысяч тон караняплодаў, нарыхтавана звыш 23 тысяч тон агародніны.

Вытворчасць сельгаспрадукцыі ва ўсіх катэгорыях гаспадарак у студзені—верасні 2020 года ў бягучых цэнах склала 2403 мільёны рублёў, што ў супастаўных цэнах на 2,1 % больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

Удзельная вага вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі Гомельскай вобласці ў рэспубліканскім паказчыку займае каля 15 %.

### МАЛАКО І МЯСА

За дзевяць месяцаў гэтага года ў грамадскім сектары Гомельскай вобласці выраблена амаль 735 тысяч тон малака. Сярэдні надой ад каровы склаў 3330 кілаграмаў. З пачатку кастрычніка бягучага года, згодна з аператыўнай інфармацыяй, у сельгасарганізацыях вобласці валавая вытворчасць малака складае 100 % да аналагічнага леташняга перыяду. За студзень—кастрычнік гэтага года выраблена (вырашчана) 155,7 тысячы тон жывёлы і птушкі: буйной рагатай жывёлы — 97,8 % да студзеня—верасня 2019 года, свіней — 118,6 % і птушкі — 97,9 %. За дзевяць месяцаў бягучага года выраблена звыш 271 мільёна штук яек.

У сельскагаспадарчых арганізацыях вобласці на 1 кастрычніка 2020 года налічваецца амаль 646 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку кароў малочнага напрамку — 220 тысяч галоў, свіней — 349 тысяч, авечак — звыш дзвюх тысяч.



Пераможца абласных «Дажынак» з Рагачоўскага раёна камбайнер Сяргей КАРПЕНКА.

Лідзіруючую пазіцыю, як па надоях малака на карову, так і па вырошчванні буйной рагатай жывёлы, займае Мазырскі раён.

Адным з самых паспяховых і перспектыўных гаспадарак Гомельскай вобласці з'яўляецца КСУП «Саўгас-камбінат «Зара» Мазырскага раёна. Гаспадарка мае поспех па ўсіх вышэйпералічаных напрамках і ўваходзіць у дзясятку найлепшых сельгасарганізацый Рэспублікі Беларусь.

### ЭКСПАРТ З ПЛЮСАМ...

Экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання з'яўляецца адным з прыярытэтаў у працы аграпрамысловых прадпрыемстваў вобласці.

За студзень—верасень бягучага года экспартавана сельскагаспадарчай прадукцыі на 334 мільёны долараў ЗША, што склала 111 % да аналагічнага перыяду мінулага года.



Пераможцы абласных «Дажынак» з Буда-Кашалёўскага раёна *(злева направа)* Васіль ГАЛАВАЦКІ і Дзмітрый КАРПАЎ.

У цяперашні час прадукцыя Гомельскай вобласці пастаўляецца ў 31 краіну свету.

Пакуль асноўным напрамкам паставак прадукцыі на экспарт з'яўляецца Расійская Федэрацыя. Гэта найбольш прэміяльны рынак як па цэнавым фактары, так і па выдатках на лагістыку. Сельгаспрадукцыі пастаўлена ў Расійскую Федэрацыю больш чым на 255 мільёнаў долараў ЗША, ці 112 %.

Прыярытэтным для аграпрамысловых прадпрыемстваў таксама застаецца рынак Казахстана. У гэтую краіну за дзевяць месяцаў бягучага года пастаўлена прадукцыі больш чым на 35 мільёнаў долараў ЗША, або 128 % да мінулага года.

Перспектыўны рынак — Кітайская Народная Рэспубліка. Сюды пастаўляецца мяса-малочная прадукцыя. Экспарт у Кітай ад Гомельскага рэгіёна — 7,2 мільёна долараў ЗША.

### ...І ЗАРОБКІ — ТАКСАМА

Заработная плата застаецца найважнейшым стымулам росту прадукцыйнасці працы, а адпаведна і эфектыўнасці працы кожнага прадпрыемства.

Па выніках васьмі месяцаў намінальна налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў у сельскай гаспадарцы Гомельскай вобласці склала 775 рублёў, што на 16 працэнтаў больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

У асобных сельскагаспадарчых арганізацыях рэгіёна заработная плата перавышае сярэднерэспубліканскі паказчык. Гэта такія гаспадаркі, як КСУП «Саўгас-камбінат «Зара» Мазырскага раёна, СВК «50 гадоў Кастрычніка» Рэчыцкага раёна, ААТ «Звязда» і ААТ «Отар» Чачэрскага раёна, ААТ «Сцяг Радзімы» Гомельскага раёна, УП «Палессе-Аграінвест» Петрыкаўскага раёна.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

**Фота БелТА.**

## Саўгас-камбінат «Зара»: НОВЫЯ РЭКОРДЫ СЕЛЬГАСЛІДАРА ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

**Алег СЛІНЬКО, дырэктар КСУП «Саўгас-камбінат «Зара», член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, уладальнік Ганаровай граматы Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.**

Прадпрыемства «Саўгас-камбінат «Зара» з году ў год пацвярджае свой статус аднаго з лідараў аграпрамысловага комплексу не толькі Гомельскага рэгіёна, але і краіны. Прадпрыемства вядомае выдатнымі паказчыкамі ў вытворчасці малака і жывёлагадоўчай галіне.

**Вядучы кірунак — свінагадоўля.**

— За мінулы год гаспадаркай было рэалізавана амаль 9,5 тысячы тон свініны. На сёння ў гаспадарцы налічваецца каля 55 тысяч галоў свіней. Рэалізацыя свініны да канца года складзе дзесяць тысяч тон, такім чынам, прыбаўка да мінулагодняга паказчыка склала 550 тон, — аб поспехах, за якімі стаіць плённая работа ўсяго калектыву, рассказвае **дырэктар саўгаса-камбіната «Зара» Алег СЛІНЬКО.** — Такога выніку мы дамагліся перш за ўсё за кошт павелічэння якасных паказчыкаў і сярэднесутачных прыбаўленняў у вазе.



Дырэктар КСУП «Саўгас-камбінат «Зара» Алег СЛІНЬКО.



Прадукцыя саўгаса-камбіната «Зара» была і застаецца запатрабаванай.

Зараз колькасць буйной рагатай жывёлы ў гаспадарцы набліжаецца да васьмі тысяч. Гэта на 700 галоў больш, чым летась.

У статку амаль дзве тысячы дойных кароў. За шэсць месяцаў 2020-га па надоях малака КСУП «Саўгас-камбінат «Зара» падняўся з 9-га месца на 6-е ў агульнарэспубліканскіх паказчыках АПК.

— Кожны дзень атрымліваем каля 50 тон малака, а гэта на паўтары тоны больш чым летась, — падкрэслівае дырэктар гаспадаркі. — У мінулым годзе надоі ад кожнай каровы склалі больш за дзесяць тон. Сёлета планку мінулага года як мінімум не знізім. Для таго каб з году ў год плюсаваць адносна малака, на працягу доўгіх гадоў паляпшалі генетычны патэнцыял статку, кампанавалі кармавую базу. Усё адпрацавана да дробязяў, што і дазволіла дасягнуць планку такога ўзроўню.

Кіраўнік сельгаспрадпрыемства адзначае, што сёння ў гаспадарцы працуе чатыры малочнатаварныя фермы і дзве фермы па вырошчванні маладняку.

— Ва ўсіх аддзяленнях бачым выдатныя вынікі, але ўсё ж аддзяленне «Барбароў» адрозніваецца: надой ад адной каровы тут вышэй, чым на іншых фермах. Калі казаць мовай лічбаў, то за дзевяць месяцаў па ферме надой на адну карову ўжо склаў каля 8,2 тоны, а валавы надой па ферме — 3270 тон, — адзначае Алег Слінько.

*У 2019 годзе калектыву КСУП «Саўгас-камбінат «Зара» аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За значны ўклад у развіццё сельскагаспадарчай галіны, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў».*

Сёлета ў саўгасе-камбінаце «Зара» адкрылі новую ферму для вырошчвання бацькоўскага статку птушкі-бройлера. На тэрыторыі фермы пяць птушнікаў. Адзін з іх на 13,8 тысячы галоў рамонтнага маладняку. У астатніх чатырох могуць размясціць па сем тысяч курэй.

— Да канца гэтага года плануем выйсці на поўныя магутнасці. Ёсць магчымасць і для далейшага пашырэння фермы — да дзесяці мільёнаў інкубацыйных яек у год. Гэта сур'ёзны ўзровень, — падкрэсліў дырэктар Алег Слінько.

Аддзяленне № 2 «Рудня» саўгаса-камбіната» Зара» спецыялізуецца на вытворчасці яек і мяса птушкі. У цяперашні час гэта сучасная птушкафабрыка, на якой змяшчаецца каля 450 тысяч галоў птушкі. З іх 200 тысяч — куры-нясушкі, 70 тысяч — маладняк курэй і куранят-бройлераў. Дарэчы, летась было выраблена 67 мільёнаў яек і выгадавана 2,6 тысячы тон куранят-бройлераў.

**Між тым саўгас-камбінат «Зара» штогод «плюсуе» практычна па ўсіх паказчыках.** Агульны вал збожжа сёлета склаў 13800 тон: (з кожнага гектара атрымалі па 49,3 цэнтнера) а гэта на тысячу тон больш, чым летась. Акрамя таго, намалацілі 800 тон насення рапсу пры ўраджайнасці 29,2 цэнтнера з гектара. У гаспадарцы нарыхтавалі 4,5 тысячы тон сенажу, у тым ліку ў поліэтыленавую плёнку 1,5 тысячы тон сена.

— Нядрэнных вынікаў у раслінаводстве нам удалося дасягнуць дзякуючы зладжанай рабоце ўсяго калектыву — механізатараў і спецыялістаў, — упэўнены кіраўнік гаспадаркі.

Гаворачы аб тым, які наогул вынікі саўгас-камбінат «Зара» плануе атрымаць да канца бягучага года, Алег Слінько адзначае:

— Нацэлены вырабіць больш за 15 тысяч тон малака, каля 15 тысяч тон мяса, з іх 10 — свініны, па 2,5 тысячы тон птушкі і ялавічыны. На такі вынік будзем выходзіць упершыню.

**Паважаныя работнікі аграпрамысловага комплексу, калектыў прадпрыемства «Саўгас-камбінат «Зара» віншуе вас з галоўным святам усіх аграрыяў —**

**ДНЁМ РАБОТНІКАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ПЕРАПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ!**

*У гэты святочны дзень выказваем шчырую падзяку за нялёгкую працу механізатарам, вадзіцелям, аператарам зернесушыльных комплексаў, жывёлаводам, спецыялістам і кіраўнікам сельскагаспадарчых арганізацый, усім работнікам аграпрамысловага комплексу.*

*Няхай нялёгкая сельскагаспадарчая праца заўсёды адказвае добрымі ўраджаямі і значнымі прыбаўленнямі ў гаспадарках! Ад усёй душы жадаем тым, хто працуе на зямлі, моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту і дастатку!*

**Дырэктар КСУП «Саўгас-камбінат «Зара» Алег СЛІНЬКО.**

*КСУП «Саўгас-камбінат «Зара» — пераможца спаборніцтва па сацыяльна-эканамічным развіцці Мазырскага раёна за 2019 год сярод сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.*



У даільным памяшканні малочнатаварнай фермы.

**Варта адзначыць, што практычна ўся прадукцыя прадпрыемства перапрацоўваецца ва ўласных цэхах. Для яе рэалізацыі працуюць 24 крамы фірменнай сеткі, якія ахопліваюць большасць раёнаў Гомельскай вобласці.**

— Выручка ад рэалізацыі прадукцыі ў месяц складае каля дзевяці мільёнаў, за бягучы год мяркуем атрымаць не менш, чым летась, а гэта каля 108 мільёнаў рублёў. Чысты прыбытак у месяц — ад 800 тысяч рублёў да мільёна. Самая высокая ў рэгіёне і выручка на аднаго працуючага — каля 70 тысяч рублёў, — падкрэслівае кіраўнік прадпрыемства.

Калектыў саўгаса-камбіната «Зара» не стаіць на месцы, не баіцца спрабаваць і эксперыментаваць, укараняць тэхналогіі, развіваць новыя кірункі. Вельмі значная роля ў рабоце прадпрыемства надаецца дабрабыту супрацоўнікаў: дастойныя ўмовы працы і адна з самых высокіх сярод прадпрыемстваў сельскагаспадарчай галіны рэгіёна сярэдняя заработная плата — 1500 рублёў.

Хочацца спадзявацца, што поспехі «Зары» стануць добрым стымулам да важкіх перамог і для іншых сельгаспрадпрыемстваў нашай краіны.

УНП 400408726

## ААТ «Гомельагракамплект»: ПЕРАДАВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ДЛЯ СУЧАСНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ



Генеральны дырэктар ААТ «Гомельагракамплект» Аляксандр СТРЫБУК.

**Адкрытае акцыянернае таварыства «Гомельагракамплект» — найбуйнейшы вытворца абсталявання для сельскай гаспадаркі ў Беларусі. Прадпрыемства выпускае шэраг спецыялізаванай прадукцыі для сучасных жывёлагадоўчых гаспадарак. Сёння брэнд «Гомельагракамплект» вядомы далёка за межамі Беларусі і пазіцыянуецца як тавар, які дэманструе аптымальнае спалучэнне цаны і якасці.**

— Адметнасць прадпрыемства — поўны вытворчы цыкл: ад праектнай распрацоўкі да дэманстрацыі работы ўсяго абсталявання ў комплексе, — адзначае **генеральны дырэктар ААТ «Гомельагракамплект» Аляксандр СТРЫБУК.** — Забяспечваем пастаўку, мантаж і поўнае тэхнічнае гарантыйнае і пострантыйнае абслугоўванне выпрабленага абсталявання. Аналізуючы змяненне попыту на рынку абсталявання для сельскагаспадарчай вытворчасці, наша прадпрыемства пастаянна пашырае асартымент прадукцыі і паслуг.

Вытворчыя магутнасці прадпрыемства дазваляюць штомесячны выпуск да ста адзінак установак па даенні ў малакаправод, да 20 адзінак даільных установак тыпаў «Елачка» і «Паралель», да ста адзінак перасоўных даільных установак з даеннем у вядро ці малакаправод, да 50 адзінак установак для індывідуальнага даення і да 30 установак для астуджэння малака аб'ёмам ад 1 да 45 тысяч літраў, да дзвюх тысяч боксаў стойлавага абсталявання для буйной рагатай жывёлы, 400 станкоў абсталявання для ўтрымання свінаматак, да 30 адзінак глебаапрацоўчага абсталявання, да 15 тысяч метраў полівінілхларыдных шлангаў і іншае тэхналагічнае абсталяванне.

ААТ «Гомельагракамплект» мае ўласныя канструктарскі і тэхналагічны аддзелы, што дазваляе на высокім тэхнічным узроўні распрацоўваць і асвойваць серыйную вытворчасць новых відаў прадукцыі і тэхнічнай аснасткі.

— На прадпрыемстве праводзіцца работа па мадэрнізацыі вытворчасці, павышэнні якасці прадукцыі, асвойваецца выпуск новага абсталявання, — падкрэслівае Аляксандр Стрыбук. — Так, асвоена вытворчасць ёмістасцяў для перавозкі вадкіх харчовых прадуктаў, кантэйнераў для паспявання сыру, навяснога абсталявання для трамбоўкі і разраўноўвання сіласных траншэяў. Працягваем развіваць уласную вытворчасць глебаапрацоўчай тэхнікі і пасяўных агрэгатаў: асвоены выпуск шыроказахватных сеялак дакладнага высеву, рэзчыкаў сіласу, захватаў для рулонаў. Сярод новых відаў нашай прадукцыі — даільная зала «Карусель», устаноўка для пастэрызацыі малака, станок універсальны для фіксацыі і апрацоўкі капыт жывёлы.

Між тым для пашырэння асартыменту прадукцыі ў 2012 годзе на прадпрыемстве быў створаны цэх па вырабе шклопакетаў і вырабаў з ПВХ-профілю. Прадукцыя ААТ «Гомельагракамплект» паспяхова выкарыстоўваецца на сельгаспрадпрыемствах краін СНД. Дылерская сетка прадпрыемства складаецца з 35 арганізацый, а геаграфія пастаўвак прадукцыі «Гомельагракамплекта» ахоплівае тэрыторыю ад Брэста да Сахаліна.

Прадпрыемствы, якія спыняюць свой выбар на прадукцыі «Гомельагракамплекта», ведаюць, што выбіраюць вядомага вытворцу, надзейнага партнёра ў бізнесе, з багатай гісторыяй і выдатнай рэпутацыяй.

— Падмурак поспеху, асноватворны фактар канкурэнтаздольнай работы нашага прадпрыемства — арыентацыя на апошнія дасягненні ў галіне вытворчасці, актыўная маркетынгавая палітыка, — упэўнены Аляксандр Стрыбук. — Неад'емны складнік поспеху — безумоўна, гэта моцны калектыў. Так, наша багацце — супрацоўнікі прадпрыемства. З нагоды Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу хацеў бы павіншаваць калектыў ААТ «Гомельагракамплект», калег і ўсіх, хто мае дачыненне да гэтага дня, з прафесійным святам. Жадаю моцнага здароўя, дабрабыту і далейшых поспехаў у забеспячэнні харчовай бяспекі роднай Беларусі!

УНП 400047886.



Устаноўка для пастэрызацыі малака прызначана для тэрмічнай апрацоўкі малака пры тэмпературы +65-75 С. Забяспечвае тры рэжымы работы.



Даільная зала «Карусель» — аптымальнае рашэнне для перадавых гаспадарак, якія імкнуцца да павышэння паказчыкаў эфектыўнасці даення з пагалоўем ад 500 да 3000 кароў. Выпускаюцца мадыфікацыі на 28—80 пастоў. Мае максімальны тэрмін службы і максімальную надзейнасць пры эксплуатацыі 24/7.



Захват для рулонаў прызначаны для падборкі, транспарціроўкі, на невялікія адлегласці, пагрузкі, а таксама складзіравання рулонаў сена, саломы, ільну ў сельгасарганізацыях.



Рэзчыкі сіласу прызначаны для парцыённага вымання, пагрузкі і транспарціроўкі на невялікія адлегласці сіласу і сенажу. Франтальныя і бакавыя нажы забяспечваюць роўны зрэз, канструкцыя закрытай формы дазваляе пазбегнуць высыпання і страты сіласнай масы.



Станок універсальны для фіксацыі і апрацоўкі капытаў БРЖ прызначаны для фіксацыі жывёлы масай да 700 кг з мэтай правядзення ветэрынарна-прафілактычных і заатэхнічных мерапрыемстваў.

# ЗЯМЛЯ АДГУКАЕЦЦА НА ПРАЦУ

## Шлях да лідараў прайшло ААТ «Отар»



Таццяна СТРУК — дырэктар ААТ «Отар».

**Дырэктар ААТ «Отар» Таццяна Струк удастоена звання «Ганаровы грамадзянін Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці», «Чалавек года Гомельскай вобласці» ў намінацыі «Чалавек на зямлі». Пачынаючы з 2010 года прызнана найлепшым кіраўніком года. Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, падзячнымі лістамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ганаровымі граматамі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта, Чачэрскага раённага выканаўчага камітэта і Чачэрскага раённага Савета дэпутатаў.**

**По выніках сёлетняга жніва адкрытае акцыянернае таварыства «Отар», што на Чачэршчыне, паказала самую высокую ўраджайнасць збожжавых у Гомельскай вобласці — 53 цэнтнера з гектара. У гаспадарцы першымі ў сваім раёне завяршылі ўборачную кампанію, яна ў лідарах у рэгіёне і па нарыхтоўцы кармоў.**

ААТ «Отар» — яскравы прыклад, як дзякуючы адказнаму дасведчанаму кіраўніку і стараннай рабоце падначаленых можна павысіць эфектыўнасць сельгасвытворчасці і дасягнуць значных вынікаў працы на зямлі. Сёння «Отар» — узорнае сельгаспрадпрыемства, якое неаднаразова было занесена на Рэспубліканскую, абласную, раённую дошкі гонару.

Колькі намаганняў укладзена ў стабільную прыбытковую работу, ведае бяссменны кіраўнік гаспадаркі Таццяна Струк. Таццяна Аляксееўна ўзначальвае прадпрыемства больш за 20 гадоў. Поспех, на яе думку, — заслуга ўсяго калектыву: ад жывёлаводаў і паляводаў да галоўных спецыялістаў. Працоўная сям'я «Отара» — амаль 200 чалавек.

Агульная зямельная плошча гаспадаркі складае больш за 6 тысяч гектараў, у тым ліку 5189 га — сельскагаспадарчыя ўгоддзі, 3437 га — ралля.

— Наша гаспадарка спецыялізуецца на жывёлагадоўлі. Эфектыўнасць галоўнай галіны ў разы пачала прыбаўляць, пачынаючы з 2011 года, калі ў аграгарадку Отар пабудавалі і ўвялі ў эксплуатацыю новы малочнатаварны комплекс, — звяртае ўвагу кіраўнік гаспадаркі Таццяна Струк. — У цэлым трымаем 6925 галоў буйной рагатай жывёлы, што на 493 галавы больш, чым летась. Наш дойны статак — 1700 кароў.

За мінулы год у «Отары» надаілі больш чым 11350 тон малака. Яго таварнасць ацэньваецца ў 92,3 %. Удой на адну карову склаў 7117 кілаграмаў.

— Звыш 70 % атрыманага малака — сортам «экстра». Летась увогуле ад рэалізацыі прадукцыі прадпрыемства атрымала выручку на 13,44 тысячы рублёў, — апелюе да лічбаў дырэктар гаспадаркі і падкрэслівае, што за імі стаіць работа зладжанай каманды ўсіх супрацоўнікаў.

Між тым ААТ «Отар» упэўнена плюсуе ў апошнія гады па ўсіх паказчыках: вытворчасці, рэалізацыі малака, мяса, збожжа. Значных паказчыкаў у гаспадарцы дасягнулі дзякуючы выкананню ўсіх агратэхналагічных нормаў і правілаў, чаму кіраўнік гаспадаркі надае вялікае значэнне.

**За дасягненне найлепшых паказчыкаў па выніках працы за 2019 год калектыў прадпрыемства ААТ «Отар» занесены на Рэспубліканскую дошку гонару.**

— Малочна-мясны кірунак патрабуе адказнай работы ў раслінаводстве, якое і спрацуе на жывёлагадоўлю, — тлумачыць Таццяна Аляксееўна. — Наша прыярэтэтная задача — моцная кармавая база, якую мы актыўна развіваем, высейваем сіласныя культуры. Мы загадзя разлічваем, колькі на пагалоўе трэба нарыхтаваць кармоў — як травяных, так і канцэнтратаў. Пралічваем пасяўныя плошчы для таго, каб нам хапіла кармоў да новага ўраджаю, бо гэта самае галоўнае.

Робяць у «Отары» і стратэгічны запас кармоў.

— Нам удаецца атрымліваць добры ўраджай кукурузы і травы: люцэрны, канюшыны. Асаблівая ўвага — нарыхтоўцы травяных кармоў. Ад колькасці і якасці фуражу залежаць вынікі жывёлагадоўчай галіны. Мы напоўніцу ацанілі перавагі ўпакоўкі сенажу ў стрэтч-плёнку. Гэтая тэхналогія забяспечвае высокую якасць, мае нізкія працоўныя выдаткі пры нарыхтоўцы і выкарыстанні. Пры захоўванні сенажу ў палімернай упакоўцы значна зніжаюцца страты, працей ажыццяўляюцца аўтаперавозкі. А галоўнае — корм атрымліваецца выдатны, нават самы добры сянаж з траншэі не заменіць яго, — дзеляцца вопытам у гаспадарцы.

**Калектыў ААТ «Отар» выказвае словы ўдзячнасці старэйшым працаўнікам гаспадаркі, якія працягваюць перадаваць свой досвед маладому пакаленню: Любові Верашчацы, Наталлі Лімантавай, Міхаілу Чарнянкову, Валянціне Гецікавай, Аляксею Шылцу, Уладзіміру Коцікаву, Галіне Капінскай, Галіне Рудзінай, Надзеі Калакольнікавай.**

**Шчыры дзякуй і тым, хто выйшаў на заслужаны адпачынак: Аляксандру Струку, Ганне Гарбачовай, Людміле Корхавай, Валянціне Асмалоўскай, Галіне Мойсавай, Мікалаю Гарбачову, Міхаілу Мінянкову, Валянціне і Васілю Бабровым, Лідзіі Медзінай, Мікалаю Калакольнікаву, Міхаілу Вошчыкаву, Зінаідзе Дуброўскай.**

Некалькі гадоў таму закупілі тры прэс-падборшчыкі. Цяпер гаспадарка мае магчымасць закладваць корм значна больш высокай якасці. Сёлета з двух укосаў нарыхтавана больш за 6 тысяч тон сенажу. Штогод закладваецца 16 траншэяў сіласу. Здараецца, што, калі вясной у суседніх гаспадарках узнікаюць праблемы з кармамі, «Отар» дапамагае.

— Сярэдняя заработная плата на прадпрыемстве ў бягучым годзе перавысіла 1200 рублёў, і можна казаць аб тэндэнцыі да яе павелічэння, — адзначае кіраўнік гаспадаркі. — Маладых спецыялістаў заахвочваем сацыяльнымі гарантыямі і жыллём. Дапамагае сваім работнікам на прыватных падворках сеяць і прыбіраць бульбу ды збожжавыя, падвозіць сена і салому, — звяртае ўвагу Таццяна Аляксееўна.

З нагоды прафесійнага свята — Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці — Таццяна Струк звяртаецца да калектыву прадпрыемства «Отар», калег, партнёраў і ўсіх працаўнікоў вёскі:

— Віншую ўсіх работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці, ветэранаў галіны! Ад душы дзякую за старанную, такую важную і патрэбную працу, плён якой чакаюць у кожным доме, — нізкі паклон за адданасць сваёй справе і любоў да роднай зямлі.



Камбайнеры і кіроўцы ААТ «Отар» на ўборачнай-2020.

УНП 490315229


**ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» —**

буйное прадпрыемства па вытворчасці птушкагадоўчай прадукцыі, вырабляе каля 5 % ад агульнага аб'ёму ў краіне і 30 % ад аб'ёмаў вытворчасці ў Гомельскай вобласці.

• Птушкафабрыка «Рассвет» з'яўляецца прадпрыемствам па вытворчасці мяса птушкі па прынцыпе замкнутага цыкла.

**Паважаныя калегі і партнёры, работнікі і ветэраны**

**СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ПЕРАПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ!**

*Вы — вялікія працаўнікі! Ад усяго сэрца віншуем Вас з прафесійным святам! Шчыры дзякуй за вашу добрасумленную працу!*

*Ад усёй душы жадаем шчасця, даўгалецця, дабрабыту вашым сем'ям, дастатку вашым дамам.*

*Міру, дабра, згоды! Поспехаў у дасягненні пастаўленых задач і працвітання вашым прадпрыемствам.*

**Калектыў ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет».**

• На прадпрыемстве арганізаваны вытворчы і радыелагічны кантроль, як сырой прадукцыі, так і прадукцыі каўбаснага цэха.

Прадукцыя падвяргаецца жорсткаму кантролю па арганалептычных і фізіка-хімічных паказчыках.

• ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» — адно з першых у Гомельскай вобласці атрымала сертыфікат адпаведнасці сістэмы кіравання якасцю і бяспекай вытворчасці мяса куранят-бройлераў на аснове аналізу рызык і крытычных кантрольных пунктаў НАССР СТБ 14701-2004.















• Структура прадпрыемства: асноўная вытворчая пляцоўка ў вёсцы Пясочная Буда, аддзяленні «Грабаўка» і «Клімаўка» Гомельскага раёна, «Старое Сяло» Рагачоўскага раёна, «Якімава Слабада» Светлагорскага раёна. На прадпрыемстве функцыянуюць цэхі: вырошчвання бройлераў, забою і перапрацоўкі птушкі, камбікармавы.

УНП 400047993

# КУРС — НА РАЗВІЦЦЁ

***ААТ «Гомельаблаграсэрвіс» на рынку паслуг для суб'ектаў аграпрамысловага комплексу вядомы як надзейны партнёр сельгаспрадпрыемстваў не толькі Гомельскага рэгіёна, але і ўсёй краіны.***



**Генеральны дырэктар ААТ «Гомельаблаграсэрвіс» Аляксандр ТОРАП.**

На прадпрыемстве значная роля адводзіцца менавіта рабоце з сельгастэхнікай, рамонту вузлоў і агрэгатаў да яе, выпуску прадукцыі і вырабу запасных частак.

**Між тым вядзецца работа па павышэнні якасці паслуг, якія аказвае адкрытае акцыянернае таварыства «Гомельаблаграсэрвіс». Так наладжана работа ўласнага тэхнічнага цэнтра, які абсталяваны цэхамі з абкатачным абсталяваннем па рамонце як поўнакамплектнай тэхнікі, так і рухавікоў, паліўнай апаратуры.**

— У рабоце ААТ «Гомельаблаграсэрвіс» сталі правілам такія падыходы, як дастаўка тэхнікі і абсталявання непасрэдна ў гаспадаркі, — адзначае **генеральны дырэктар ААТ «Гомельаблаграсэрвіс» Аляксандр ТОРАП.** — Праз таваралраводную сетку пастаўляем гуматэхнічныя вырабы, запасныя часткі да сельскагаспадарчай тэхнікі, трактароў і аўтамабіляў.

Кіраўнік прадпрыемства звяртае ўвагу і на тое, што дзякуючы развіццю прамых гаспадарчых сувязяў з айчыннымі і замежнымі заводамі-вытворцамі пашырылася і ўдасканалілася работа дылерскай сеткі.

— Забяспечваем пастаўкі сельгасвытворцам у самыя кароткія тэрміны без пасрэднікаў, — дадае Аляксандр Торап.

Дарэчы, падчас сёлетняй уборачнай кампаніі на Гомельшчыне ААТ «Гомельаблаграсэрвіс» накіравала першую партыю новых газаматорных камбайнаў вытворчасці ААТ «Гомсельмаш» у гаспадаркі рэгіёна. Эксклюзіўная распрацоўка гомельскіх канструктараў летась паспяхова прайшла палявыя выпрабаванні ў Беларусі і Казахстане. Тэхніку ад «Гомельаблаграсэрвіса» атрымалі ў Буда-Кашалёўскім, Веткаўскім, Рэчыцкім, Добрушскім і Ельскім раёнах.

Генеральны дырэктар «Гомельаблаграсэрвіса» звяртае ўвагу: такая тэхніка паспяхова будзе працаваць на палях з высокай ураджайнасцю. У суперкамбайне прадугледжаны тэхналагічныя элементы для змяншэння страт збожжа пры ўборцы і больш камфартабельная кабіна, аснашчаная добрай кліматычнай і мультымедыйнай устаноўкамі. Да таго ж цана газу ўдвая меншая за дызпаліва. І, што немалаважна, адной запраўкі хопіць на цэлую змену; 1,5 тысячы кубоў газу расходуецца на працягу 10 гадзін работы.

> **ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ!**
>
> *Ад усяго калектыву ААТ «Гомельаблаграсэрвіс» віншую вас з прафесійным святам усіх працаўнікоў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці.*
>
> *Жадаю моцнага здароўя, кар'ернага росту, увасаблення новых ідэй, укаранення інавацый і высокай прадукцыйнасці. Дастатку вашым дамам, міру і шчасця вашым сем'ям!*
>
> **Генеральны дырэктар ААТ «Гомельаблаграсэрвіс» Аляксандр ТОРАП.**





**ААТ «Гомельаблаграсэрвіс» створана ў 2003 годзе шляхам зліцця ААТ «Гомельаблагразаб» і «Лазурны міжрайагразаб».**

Між тым з году ў год прадпрыемствы сістэмы «Гомельаблаграсэрвіс» нарошчваюць аб'ёмы і павялічваюць спектр паслуг па абслугоўванні сельскай гаспадаркі.

— Прыярытэтныя задачы ААТ «Гомельаблаграсэрвіс», якія мы нацэлены актыўна развіваць і далей, — гэта пашырэнне і ўдасканаленне дылерскай сеткі, нарошчванне аб'ёмаў уласнай вытворчасці, павышэнне ўзроўню і развіццё шырокага спектра паслуг па абслугоўванні прадпрыемстваў сельскай гаспадаркі, — падкрэслівае кіраўнік таварыства. Ён дадае, што сёння на Гомельшчыне ёсць патэнцыял і тэхнічныя магчымасці, якія дазваляюць канкурэнтаздольна працаваць: рамантаваць і прыводзіць у рабочы стан тэхніку, абсталяванне для жывёлагадоўлі. Гэта дазволіць дастойна справіцца з яшчэ адной прыярытэтнай задачай — вывесці работу на новы ўзровень.

У Гомельскай вобласці прадпрыемства «Гомельаблаграсэрвіс» — база для актыўнага развіцця другаснага рынку сельгастэхнікі. Менавіта спецыялісты Гомельшчыны ўвялі ў эксплуатацыю цэх па паглыбленым капітальна-аднаўленчым рамонце энерганасычаных трактароў «Беларус», корма- і збожжаўборачных камбайнаў вытворчасці ААТ «Гомсельмаш». На ААТ «Гомельаблаграсэрвіс» працуюць участкі па рамонце айчынных і замежных рухавікоў і гідраўлічнай апаратуры.

— Не менш актуальнае пытанне для нашага рэгіёна — тэхнічнае абслугоўванне жывёлагадоўчага абсталявання, — звяртае ўвагу Аляксандр Торап. — Мы ўсе зацікаўлены ў тым, каб малако было высокай якасці, надоі раслі, таму абсталяванне павінна быць сучаснае, працаваць без збояў і па тэхналогіі. На месцах мы імкнёмся прапаноўваць паслугі так, каб было зручна і сельгасарганізацыям, і фермерам.



**На базе ААТ «Гомельаблаграсэрвіс» створаны тэхнічныя цэнтры па абслугоўванні ў гарантыйны і постгарантыйны перыяды эксплуатацыі тэхнікі і абсталявання заводаў-вытворцаў ААТ «Мінскі трактарны завод», ААТ «Гомсельмаш», ААТ «Амкадор», рухавікоў вытворчасці ААТ «Мінскі маторны завод», «Дэтройт-Дызель», «Дойц», «Volvo Penta».**

УНП 490314169

# «СЛУЖБА ВЫРАТАВАННЯ»
## ДЛЯ ГАСПАДАРАК ПРЫПЯЦКАГА ПАЛЕССЯ

### ААТ «Мазыртэхсэрвіс» — больш за 85 гадоў на рынку Рэспублікі Беларусь

**Прадпрыемства вядомае ў рэгіёне як шматпрофільная арганізацыя з моцнай вытворчай базай. Гатоўнасць брацца за любыя індывідуальныя і самыя нестандартныя заказы, — фірменны стыль у рабоце «Мазыртэхсэрвіса».**

Сёння прадпрыемства спецыялізуецца на вырабе сельскагаспадарчай тэхнікі, забяспечвае рамонт і тэхнічнае абслугоўванне сельгасмашын, абсталявання жывёлагадоўчых ферм і іншых сельгасаб'ектаў. Між тым, ААТ «Мазыртэхсэрвіс» выконвае будаўніча-мантажныя і электрамантажныя работы, ажыццяўляе рамонт халадзільнага і даільнага абсталявання, рухавікоў, паліўнай апаратуры, кормараздатчыкаў, паўпрычэпаў, вузлоў трактароў МТЗ, кормаўборачнай тэхнікі, аказвае транспартныя паслугі, а таксама паслугі спецтэхнікі.

**Вытворчая структура прадпрыемства ўключае:**

- **вытворчы цэх** (выраб сельгасмашын і абсталявання, металаканструкцый; рамонт сельскагаспадарчых машын, а таксама вузлоў і агрэгатаў да іх);
- **перасоўную механізаваную калону** (будаўніцтва арачных будынкаў і збудаванняў; рамонт, мантаж і наладку жывёлагадоўчага і збожжасушыльнага абсталявання, рамонт і тэхнічнае абслугоўванне даільнага і халадзільнага абсталяванняў на жывёлагадоўчых комплексах);
- **механізаваны атрад** (аказвае паслугі па перавозцы пасажыраў і грузаў, паслугі спецтэхнікі).

**ААТ «Мазыртэхсэрвіс» ВЫРАБЛЯЕ:**

- пнеўматычныя сеялкі дакладнага высеву для прапашных культур;
- зерневыя сеялкі;
- загрузчыкі сеялак шнэкавыя;
- культыватары-апырсквальнікі;
- шыроказахватныя культыватары;
- апырсквальнікі паўпрычэпныя штангавыя;
- канвееры стужачныя;
- норыі збожжавыя;
- бескаркасныя арачныя будынкі з ацынкаванай сталі;
- стойлавае абсталяванне для жывёлагадоўчых ферм;
- групавыя паілкі з падагрэвам для буйной рагатай жывёлы;
- вароты металічныя;
- спіральныя сталёвыя бункеры;
- нестандартнае абсталяванне.







«Служэнне інтарэсам і запытам заказчыкаў, павышэнне дабрабыту кожнага работніка — галоўныя задачы калектыву» — пад такім дэвізам сёння будуецца вытворчая палітыка ААТ «Мазыртэхсэрвіс». Прыярытэтнай задачай для прадпрыемства застаецца забеспячэнне рэнтабельнай вытворчасці. Для гэтага ўкараняюцца новыя падыходы ў працы, асвойваюцца перспектыўныя кірункі.

— Пашыраючы паслугі, прадпрыемства ідзе верным курсам: рост выручкі за апошнія два гады — больш за 180 %. Прыбытак павялічваецца за кошт росту аб'ёму вытворчасці і паслуг, — адзначае **дырэктр ААТ «Мазыртэхсэрвіс» Аляксей БАРАНАЎ.**

— У нас маюцца аўтакраны, аўтавышкі, аўтабетонамяшалка і іншая тэхніка, а таксама станочнае абсталяванне, якое валодае высокай дакладнасцю апрацоўкі металу. Таму прадпрыемства гатова забяспечыць вытворчасць самых розных вырабаў: ад пасяўной і глебаапрацоўчай тэхнікі, стойлавага абсталявання для жывёлагадоўчых ферм да хлебапякарных печаў, — падкрэслівае **намеснік дырэктара па вытворчасці ААТ «Мазыртэхсэрвіс» Уладзіслаў ЛАЗІБЕЕЎ.**

Прадпрыемству ўдаецца трывала стаяць на нагах, з году ў год павялічваць тэмпы росту выручкі дзякуючы бесперапыннаму пошуку новых ідэй па паляпшэнні эканамічнага становішча, упэўнены ў калектыве.

Сёлета ААТ «Мазыртэхсэрвіс» рэалізаваў некалькі дзясяткаў збожжавых сеялак. Выпуск гэтай імпартазамяшчальнай тэхнікі, а таксама камплектуючых да яе будзе працягвацца. У красавіку на прадпрыемстве завяршылі вытворчасць чарговай партыі шматмэтавых пнеўматычных кукурузных сеялак дакладнага высеву, іх у гэтым годзе было выпушчана 13, адрамантавана 65. Пачата вытворчасць шыроказахватных культыватараў для перадпасяўной апрацоўкі глебы, загрузчыкаў сеялак шнэкавых, вядзецца работа па асваенні апырсквальнікаў паўпрычэпных штангавых.

Трэба адзначыць, што тут забяспечваюць сваю транспартную дастаўку: забіраюць і прывозяць тэхніку.

На інфармацыйным стэндзе ў холе ААТ «Мазыртэхсэрвіс» фіксуюць фотасправаздачы — «да» і «пасля» капітальных рамонтаў сельгасмашын і абсталявання. Кажуць, бывалі выпадкі, што гаспадары не пазнавалі сваю тэхніку пасля аднаўленчых работ. Яшчэ адна візітная картка — склад-крама запасных частак для сельгастэхнікі і агрэгатаў, якія працуе на тэрыторыі сэрвісу. Тут можна купіць дэталь амаль для любой тэхнікі, цяпер не трэба чакаць, пакуль патрэбныя для замены камплектуючыя прыедуць з Мінска.

У цэлым ААТ «Мазыртэхсэрвіс» — прыклад прадпрыемства, дзе, узяўшы курс на развіццё, дастойна спраўляюцца з выклікамі часу — асвойваюць вытворчасць новай тэхнікі, пашыраюць віды паслуг.

УНП 490803579




ГОМЕЛЬСКИЙ МЯСОКОМБИНАТ 1896

# САКРЭТ ПАПУЛЯРНАСЦІ «Сантарыні»



Якасць прадукцыі пад пільным кантролем намесніка начальніка вытворча-тэхнічнай лабараторыі Надзеі ВАЛЮШКІНАЙ і інжынера-хіміка Марыі ПРАКОФ'ЕВАЙ.

**Гісторыя Гомельскага мясакамбіната бярэ свой пачатак у далёкім 1923 годзе. Зараз гэта адно з буйнейшых у краіне прадпрыемстваў па перапрацоўцы мяса, яно пастаянна нарошчвае аб'ёмы вытворчасці каўбасных вырабаў і мясных паўфабрыкатаў. Пра ўзровень яго прадукцыі гаворыць той факт, што больш за чвэрць яе пастаўляецца на экспарт. А таксама самі за сябе сведчаць шматлікія медалі і дыпломы міжнародных выставак і конкурсаў. Напярэдадні прафесійнага свята журналісты «Звязды» пагутарылі з намеснікам дырэктара па ідэалагічнай рабоце, сацыяльных пытаннях і адміністратыўна-гаспадарчай часткі Наталляй САМАФАЛАВАЙ.**

— Нядаўна нас парадавалі гомельскія пенсіянеры, — расказвае Наталля Мікалаеўна. — Праўда, спачатку напужалі, пакуль мы разабраліся, што да чаго. Сказалі, «напішам на вас». Аказалася, не скаргу. Яны задаволены ўвагай да іх з нашага боку, нашай прадукцыяй, якая і смачная, і даступная для іх па цане. І збіраюцца напісаць пісьмо губернатару з падзякай адміністрацыі камбіната за клопат.

Што ж, любое харчовае прадпрыемства арыентуецца на разнастайныя групы насельніцтва, і мы не выключэнне.

Раней, калі я працавала не на мясакамбінаце, ведала толькі адну яго «Мядовую» каўбасу, якая падабалася. Зараз, калі пазнаёмілася з асартыментам бліжэй, разумею, што абкрадвала сябе, можна сказаць, бо пералік прадукцыі вельмі разнастайны. І асартыментная палітыка такая, што да стала людзей павінны быць і «віпаўскія», скажам так, прадукты, і на кожны дзень, не надта дарагія, але якасныя і смачныя. Таму ў асартыментным пераліку і далікатэсныя прадукты, як «Сантарыні», «Пепероні прэміум», «Сальчычон», альбо каўбасы вышэйшага гатунку «Італьянская», «Аўстрыйская» і іншыя сыравэнджаныя, варана-вэнджаныя, сыравяленыя, гамбургер мясны (іх пералік можна доўжыць), так і разлічаныя на больш шырокі ўжытак прадукт з свініны «Славянскі», вяндліна «Сямейная» сечаная, чыпсы мясныя ў асартыменце і пельмені «Рускія»... Усяго 120 найменняў толькі каўбас і больш за 100 найменняў паўфабрыкатаў — смачная і сытная высакаякасная прадукцыя — у тым ліку і для далікатнага дзіцячага харчавання. Асартымент сапраўды разнастайны, пастаянна абнаўляецца і здольны задаволіць любы густ. Важна і тое, што прадукцыя вырабляецца без выкарыстання ГМА і вадкага дыму, пры строгім кантролі паказчыкаў бяспекі і ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі.

Але скажу, магчыма, парадаксальную рэч. Мы не зможам па-сапраўднаму ўлічваць смакавыя перавагі, пажаданні спажыўцоў прадукцыі, калі не навучымся працаваць са сваім калектывам, каб засяродзіць яго намаганні ў патрэбным вытворчым кірунку. Таму шмат увагі ўдзяляем уласнаму калектыву, сацыяльным аспектам яго жыцця. Перш за ўсё імкнёмся ўлічваць інтарэсы працаўнікоў, пачынаючы з элементарнага. Яны атрымліваюць бясплатныя абеды ў заводскай сталовай коштам паўтара рублі ў змену.

Графік работы сталовай прыстасоўваецца да графіка рабочых змен вытворчых падраздзяленняў, а ў кожнага ў сілу спецыфікі ён можа быць свой. Згодна з калектыўным дагаворам людзі атрымліваюць таксама харчовыя наборы.

Калі хто ведае, што такое праца на мясакамбінаце, той разумее, наколькі гэта няпроста нават фізічна. А ў нас людзі працуюць па 25–30 гадоў, і я гляджу на іх з захапленнем. Хочацца зрабіць для іх нешта добрае. Я на прадпрыемстве з 2018 года, за гэты час пастараліся захаваць тыя традыцыі, што тут былі, і завесці новыя. Пакуль у нашу работу не ўмяшаўся каранавірус, мы працавалі планава, а штогадовы план прадугледжваў кожны месяц нейкія мерапрыемствы. Яны масава пайшлі з 23 лютага і 8 сакавіка, калі мы ўшанавалі сваіх мужчын і жанчын, а апошніх большасць на прадпрыемстве. Затым быў «Пасхальны куліч» — сапраўдны конкурс упрыгажэнняў і смакавых пераваг.



Агляд гатовай прадукцыі праводзіць намеснік начальніка каўбаснага цэха Святлана ГАРДЗЕЕВА.



Намеснік дырэктара Наталля САМАФАЛАВА расказала пра справы на прадпрыемстве.



На гэтым участку працуюць фармоўшчыкі Аксана ЯКІМЕНКА і Уладзімір ВЕРАМЕЕНКА.




Супрацоўнікі фірменнага магазіна Юлія АЗЯЎЧЫКАВА і Ірына КРАЎЧАНКА.

І Дзень маці мы святкавалі, ушаноўвалі шматдзетных маці і тых жанчын, у каго праблемныя, скажам так, дзеткі, але не менш дарагія і любімыя. Для ўрачыстых мерапрыемстваў арэндуем вялікую залу, каб стварыць святочную атмасферу. І пачалі рабіць сваю.

Летась да прафесійнага свята прымеркавалі вялікі канцэрт, збіраліся ў памяшканні драматычнага тэатра ў цэнтры горада. Людзі прыйшлі па-святочнаму апранутыя, іх рассадзілі ў прыгожым месцы, запрасілі папулярны калектыў са сталіцы... На сцэну ўзышлі 80 нашых перадавікоў. Сёлета таксама на прафесійнае свята рыхтуемся ўшаноўваць лепшых.

Як я ўжо казала, завод наш з багатай гісторыяй. Таму тлумачу амаль кожнаму навічку, што я не магу прымусіць вас палюбіць гэты завод, але ў любым выпадку прашу паважаць яго — за яго традыцыі, за тое, што корміць вялікую колькасць людзей свайго рэгіёна смачнай, якаснай прадукцыяй. І кожны на сваім рабочым месцы павінен дастойна выконваць тую работу, за якую ўзяўся.

Нядаўна нам выказаў падзяку губернатар за работу са студэнцкім атрадам адной з ВНУ. Яны упакоўвалі мясныя чыпсы, іншую прадукцыю. Адпрацавалі, у прынцыпе, няблага. Мы атрымалі вопыт работы з моладдзю, бо да нас на працу прыходзяць і іх равеснікі. А калі калектыў не амаладжваецца, перспектывы ў яго не будзе.

І я пачала з яшчэ большай павагай глядзець на дарослых членаў свайго калектыву, які склаўся даўно. Яны разумеюць, што такое добрае карпаратыўнае імя, што такое абавязак перад таварышамі, станоўчы імідж, пра захаванне якога варта клапаціцца ўсім.

Карпаратыўнае правіла такое: прыйшла машына з жывёлай, патрэбна застаца, каб усё зрабіць, — значыць, засталіся і зрабілі. Гэта будзе ўлічана пры налічэнні прэміі. І кіраўнік любога рангу — майстар ці начальнік цэха, іншага падраздзялення — ведае, што на сваіх людзей ён можа спадзявацца ў любой вытворчай сітуацыі.

Мы клапоцімся пра такую згуртаванасць, пра тое, каб людзі даражылі добрым імем свайго завода. Каб адчувалі таварыскае плячо, а ў выніку ганарыліся тым, што тут працуюць. І дбаем пра сумеснае правядзенне вольнага часу.

З'яднанасці калектыву спрыяе і сумесная высадка маладых дрэўцаў у Навабеліцы — новым раёне горада; фестываль, што арганізоўвае наш холдынг, — нам даюць пляцоўку каля Лядовага палаца, і мы паказваем, на што здольныя. І наша Зімовая алімпіяда, і свае Летнія Алімпійскія гульні — у спартыўных святах ахвотна прымаюць удзел нават людзі з начных змен. А таксама кіраўнікі вытворчых падраздзяленняў, дырэктар завода Дзмітрый Юр'евіч Корж, спецыялісты.

Клапоцімся пра быт людзей. Маем свой інтэрнат. Невялікі, і жывуць там маладыя спецыялісты — выпускнікі профільных навучальных установ, якія прыехалі да нас працаваць. Хадайнічаем перад прадпрыемствамі Гомеля, калі некаму не хапіла месца, каб размясціць іх у іншых інтэрнатах горада.

У членаў калектыву ёсць медыцынская страхоўка — цудоўны пакет, палову кошту аплаціла прадпрыемства. Штогод прыганяем «пульмаскан» на завод, бо прадпрыемства харчовае. На ўласным здраўпункце вядзе прыём урач-тэрапеўт першай катэгорыі.

І яшчэ штрых у тэму. Нядаўна на Дзень маці нашы жанчыны на прахадной атрымалі кветкі ад мужчын — 700 ружаў. А разам з кветкамі — і добры працоўны настрой на ўвесь дзень.

УНП 400078293



У гандлёвай зале фірменнага магазіна мясакамбіната.

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі Наталля КАПРЫЛЕНКА, Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Святлана СУШКО, Вольга ГЕЦЭВІЧ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіваў прадпрыемстваў.

Песню бярыце з сабою...

Рубрыку вядзе кампазітар Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com



# Туманы над Белай Руссю

**Анатоль Сыс (1959-2005) — вядомы беларускі паэт. Скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны. У розныя гады працаваў у Веткаўскай раённай газеце, на Беларускім тэлебачанні. Пры жыцці выйшлі паэтычныя зборнікі «Агмень», «Пан лес», «Сыс», пасля заўчаснай смерці надрукаваны зборы твораў «Лён», «Alaiza», «Берагі майго юнацтва».**

**Вершы — Анатоль СЫС,**
**музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.**

***1.*** Вясёлка над Белай Руссю —
гэта мая мара,
ляцяць пад вясёлку гусі,
нібы пад вянец, па парах.

***Прыпеў (2 разы):***
Туманы над Белай Руссю —
гэта мая самота,
да белай зямлі тулюся,
аб ёй мой найпершы клопат.

***2.*** Завеі над Белай Руссю —
гэта мае пакуты,
ды я ўсё адно, як бусел,
да гэтай зямлі прыкуты.

***Прыпеў (2 разы):***

***Пройгрыш.***

***3.*** Грымоты над Белай Руссю —
гэта мае трывогі
па песнях знябытых гусляў
каля твайго парога.

***Прыпеў (2 разы):***

***Пройгрыш.***




## Манеты

### Ад птушкі года да юбілеяў класікаў

**У наступным годзе Нацыянальны банк краіны выпусціць у абарачэнне 16 найменняў памятных манет. Гэта паведаміла прэс-служба нашага фінансавага рэгулятара.**

Ужо традыцыйна кожны год грамадскае аб'яднанне «Ахова птушак Бацькаўшчыны» выбірае птушку года, якую абавязкова чаканяць у метале. У 2021 годзе такой птушкай выбраны ляляк звычайны. Манета «Ляляк звычайны» стане 15-й у серыі памятных манет «Птушкай года». Выпуск на прыродаахоўную тэматыку будзе таксама працягнуты памятнай манетай «Заказнік «Ельня» ў рамках серыі «Заказнікі Беларусі».

Манеты спартыўнай тэматыкі традыцыйна папулярныя ў Беларусі і за мяжой. Улічваючы заслугі нашых спартсменаў, будуць выпушчаныя ў абарачэнне памятныя манеты «Летнія віды спорту. Баскетбол».

Выпуск памятных манет будзе прысвечаны юбілейным датам: 100-й гадавіне заснавання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, 125-годдзю з дня нараджэння беларускага пісьменніка Кандрата Крапівы, 100-годдзю з дня нараджэння беларускага пісьменніка Івана Мележа, 100-годдзю з дня нараджэння беларускага пісьменніка Івана Шамякіна.

У Нацбанку вырашылі нагадаць, што ў наступным годзе спаўняецца 25 гадоў з дня трагічнай даты — гібелі ваеннага лётчыка Уладзіміра Карвата. Гэты мужны чалавек 23 мая 1996 года пры выкананні вучэбна-трэніровачнага палёту адвёў самалёт, які стаў падаць, ад населенага пункта. У памяць аб гэтым подзвігу будзе выпушчана ў абарачэнне манета «Уладзімір Карват. Герой Беларусі».

Тэматыка гісторыка-культурных каштоўнасцяў будзе працягнута памятнымі манетамі «Разьба па дрэве» серыі «Народныя промыслы і рамёствы беларусаў», «Беларускі касцюм», «Культурныя каштоўнасці. Беларусь — Ліга», а таксама памятнымі манетамі серыі «Архітэктурная спадчына Беларусі», «Жывёльны свет на гербах гарадоў Беларусі» і «Рэгіянальныя канфесіі Беларусі: «Каталіцызм».

Традыцыйна ў працяг серыі «Кітайскі каляндар» у 2021 годзе будзе выпушчана памятная манета «Год Тыгра».

**Сяргей КУРКАЧ.**

Даты | Падзеі | Людзі

### 13 ЛІСТАПАДА

У краіне

**1930** год — нарадзілася Валянціна Іванаўна Крыкава, артыстка балета, народная артыстка Беларусі. У 1947—1968 гг. салістка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.

У гэты ж дзень заснаваны Інстытут лесу НАН Беларусі. Заснаваны ў Гомелі як Беларускі лесапрамысловы інстытут на базе ляснога аддзела Беларускага НДІ сельскай і лясной гаспадаркі, з 1932-га — Беларускі НДІ лясной гаспадаркі, з 1992-га — дзяржаўная навуковая ўстанова з сучасной назвай.



**1970** год — нарадзілася Жанна Віктараўна Шубянок, беларуская спартсменка (сучаснае пяцібор'е), заслужаны майстар спорту Беларусі. Бронзавы прызёр чэмпіянатаў свету сярод юніёраў. Чэмпіёнка свету, сярэбраны прызёр у асабістым заліку, бронзавы прызёр у эстафеце. Чэмпіёнка Еўропы ў асабістым і камандным заліках. Сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы ў камандным заліку і эстафеце, бронзавы прызёр у асабістым заліку. Уладальніца і сярэбраны прызёр Кубка свету ў асабістым заліку. Пераможніца і прызёр этапаў Кубка свету.

У свеце

**1850** год — нарадзіўся Роберт Льюіс Стывенсан, англійскі пісьменнік, крытык, публіцыст, майстар прыгодніцкага жанру. Аўтар раманаў «Востраў скарбаў», «Чорная страла», «Дзіўная гісторыя доктара Джэкіла і містара Хайда».

**1955** год — нарадзілася Вупі Голдберг (Кэрын Элейн Джонсан), амерыканская актрыса, пісьменніца, прадзюсар і тэлевядучая. Адна з нямногіх знакамітасцяў, якія ўдастоены чатырох прэстыжных амерыканскіх узнагарод: «Оскар», «Грэмі», «Эмі» і «Тоні». У яе скарбонцы прафесійных трафеяў таксама маюцца два «Залатыя глобусы», BAFTA і зорка на Алеі славы.

Так гаварылі...

**ЭПІКУР:**

*«Хто здаецца страшным, той не можа быць свабодным ад страху».*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.34 | 17.13 | 8.39 |
| Віцебск — | 8.28 | 16.58 | 8.30 |
| Магілёў — | 8.24 | 17.03 | 8.39 |
| Гомель — | 8.14 | 17.06 | 8.52 |
| Гродна — | 8.48 | 17.30 | 8.42 |
| Брэст — | 8.42 | 17.36 | 8.54 |

## Месяц

*Апошняя квадра 8 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

## Імяніны

*Пр. Аляксандра, Аляксея, Анатоля, Івана, Сяргея, Усевалада, Якава.*
*К. Валянціны, Хрысціны, Мікалая.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА









ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3515.
Нумар падпісаны ў 19.30 12 лістапада 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12